PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 7 (2440) Год XLVIII Беласток, 16 лютага 2003 г. Цана 2,00 зл.

Змаганне варшаўскіх сялян

Яўген Мірановіч

Ад некалькіх тыдняў не спыняецца дыскусія наконт кампенсацыі з боку Еўрасаюза для сялян Польшчы. Прадметам дыскусіі аднак не з'яўляецца сума грошай, а толькі спосаб яе падзелу. Варшаўскія сяляне з ПСЛ, Самаабароны і пару нацыянальных груповак дамагаюцца заплаты кожнаму, хто мае зямлю. Еўрасаюзныя чыноўнікі хацелі б часткова плаціць такім метадам, але ў асноўным даваць грошы тым, якія даюць прадукцыю. Прэм'ер-міністр Лешэк Мілер і большасць яго палітычнага лагера ад СЛД быццам схільны прыняць еўрасаюзныя прапановы. Тым часам справа выклікае так вялікія эмоцыі, што варшаўскія сяляне нават пагражаюць выхадам з урадавай кааліцыі.

Звычайны грамадзянін няшмат разумее з гэтага вялікага інфармацыйнага шуму. СЛД, партыйная эліта якога мае свае інтарэсы ў банках, вялікіх страхавых фірмах, радыёвяшчанні і тэлебачанні, манапалістычных прадпрыемствах, як тэлекамунікацыя ці нафтавы канцэрн „Орлен" не хоча перш за ўсё ўскладняць адносін з Еўрасаюзам, а справа падзелу еўрасаюзных грошай з'яўляецца для іх другараднай. ПСЛ прадстаўляе інтарэсы варшаўскага сялянства, якое апошнімі гадамі набывала зямлю ў паўночных і ўсходніх ваяводствах. Некаторыя сталі ўласнікамі соцень і тысяч гектараў са спадзяваннем на еўрасаюзныя датацыі. Большасць свае зямлі ніколі не бачыла і бачыць не хоча. Для іх найважнейшай справай становіцца спосаб дзялення гэтых грошай. Датацыя да сельгаспрадукцыі абазначала б, што ўся стратэгія і інвестыцыі накіраваныя на атрыманне еўрасаюзных грошай былі б памылковымі.

З другога боку датацыя да прадукцыі была б падтрымкай для тых, якія сапраўды займаюцца сельскай гаспадаркай, для фермераў, якія пастаўляюць свае вырабы на рынак. Фінансавыя сродкі сяляне найчасцей выкарыстоўваюць на інвестыцыі, што ў канцы канцоў вядзе да павелічэння колькасці тавараў і зніжэння іх цэн. Так доўгімі дзесяцігоддзямі падтрымлівалася заходнееўрапейская сельская гаспадарка. Там аднак вытворцы харчовых прадуктаў разам з сем'ямі складаюць у сярэднім 5 працэнтаў насельніцтва. У нас адсотак гэты перавышае 35 працэнтаў. Датацыя да зямлі гэта фінансаванне скансэна. Ведаючы традыцыю і так большасць гэтых грошай трапіць у вясковыя крамы. Лепшую кан'юнктуру могуць мець толькі спіртзаводы і бровары.

Большасць уласнікаў зямлі, якая ляжыць вакол маёй вёскі Алексічы, што

[працяг ☞ 2]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Члены камісіі (злева): Надзея Панасюк, Валянціна Бабулевіч і Васіль Сакоўскі

Зацікаўленне традыцыяй і спадчынай

У раённых элімінацыях IX выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія 15 студзеня адбыліся ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, прынялі ўдзел 39 ліцэістаў. Тэмы пісьмовых і вусных прац звязаны былі з фальклорам.

— Многа месца адвялі мы ў гэтым годзе фальклору па прычыне 105 угодкаў з дня выдання кнігі Міхала Федароўскага „Люд беларускі". Была гэта вялікая гістарычная падзея, паколькі ў кнізе змешчаны паданні, песні і казкі запісаныя на Бельшчыне, Сакольшчыне, Гродзеншчыне і Ваўкавыскай зямлі, — заявіў старшыня конкурснай камісіі, прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

У час алімпіяды вучням прапанавалася пісаць працы па беларускай народнай абраднасці, звязанай з хрысцінамі, вяселлем або хаўтурамі, ці аналізаваць уплыў фальклору на беларускую мастацкую літаратуру. Многія, аднак, рашыліся пісаць пра беларускі каляндарны абрад, характэрны сваёй мясцовасці або сям'і. Дадатковае пытанне тычылася граматыкі. Ліцэісты ўстаўлялі прапушчаныя літары і дапісвалі суфіксы і канчаткі. Тэмы вусных адказаў тычыліся фальклору, сямейнага жыцця, школы, роднай мясцовасці і наваколля, а перш за ўсё беларускай літаратуры ад часоў Вялікага княства Літоўскага да сучаснасці. Былі таксама пытанні пра эміграцыйную літаратуру і „белавежцаў". Прафесар Аляксандр Баршчэўскі ў артыкуле „Беларускае пісьменства Усходняй Беласточчыны", змешчаным у даведніку прымеркаваным да алімпіяды, пісаў пра даследаванне беларускага фальклору на Беласточчыне, беларускую публіцыстыку і літаратурную творчасць. Вучні маглі выкарыстоўваць гэты матэрыял у час падрыхтоўкі да алімпіяды.

— Вучні добра падрыхтаваліся да пісьмовых прац. З кожным годам лепш гавораць на беларускай літаратурнай мове. Вучні найахвотней пісалі пра мясцовую традыцыю. Заўважаецца сур'ёзнае зацікаўленне сваёй спадчынай. Пра сваю мясцовасць вучні не даведаюцца са сродкаў масавай інфармацыі або кніжак, але мусяць пытаць старэйшых людзей, — паінфармаваў член конкурснай камісіі Васіль Сакоўскі.

Сёлета сярод удзельнікаў раённых элімінацый было ажно 29 гайнаўскіх белліцэістаў і 10 вучняў з Бельскага белліцэя. Першае месца занялі Наталля Зофія Лемеш і Барбара Харкевіч з Гайнаўскага белліцэя, якія набралі па 95 (на 100 магчымых) балаў. Другое месца заняла Ева Кот з Гайнаўскага белліцэя (94 балы), а трэцяе Аліна Асташэвіч з Бельскага белліцэя (93). Разам на цэнтральныя элімінацыі перайшлі 18 вучняў з Гайнаўскага і 6 — з Бельскага белліцэяў.

— Цешыць вялікае зацікаўленне Алімпіядай беларускай мовы, бо алімпіяды, да якіх прыступае мала асоб, ліквідуюцца. У гэтым годзе мы звярнуліся да 20 вышэйшых навучальных устаноў з пытаннем, ці прымуць лаўрэатаў і фіналістаў цэнтральнага этапу Алімпіяды беларускай мовы. Большасць вучэльняў адказала станоўча, — паведаміў прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Аляксей Мароз

Мы не хочам супермаркета ☞ 3

Бурмістр Гайнаўкі з цяжкасцю прабіраўся праз натоўп людзей, якія сабраліся ў канферэнц-зале магістрата і на калідоры. Каля 200 уласнікаў магазінаў, прадпрымальнікаў і працаўнікоў гандлёвай арганізацыі ПСС „Сполэм" пратэставалі супраць праекта будовы супермаркета ў цэнтры горада — паміж вуліцамі Баторыя і 11 Лістапада.

І зноў багна ☞ 4

Ужо раз з сеймавай трыбуны пасол Фэдаровіч выказваўся, хоць не даказваў, што нацыянальных меншасцей, у тым і беларускай, у Польшчы няма. У гэты раз — у час публічнай дыскусіі ва Універсітэце ў Беластоку, пры задавальненні сваіх паплечнікаў, распавядаў: „Я — талерантны, бо не забіў ні аднаго жыда, ні педзіка", „няма беларускай меншасці, ёсць толькі праваслаўныя палякі".

Праца, хобі і прыгода... ☞ 5

Шчыра кажучы, бібліятэка ад пачатку да сённяшняга дня — маё дзіця. Гэта праца, хобі і прыгода на ўсё жыццё. А пачыналася так. У адным з памяшканняў Музея стаялі шафы, у якіх у бязладдзі было згружана каля тысячы кніжак. Не было ні эвідэнцыі, ні картатэкі. Вось і ўзялася я ўпарадкаваць гэту звалку, зрабіць сапраўдную бібліятэку.

Разнароднасць калядавання ☞ 9

Вучні з Ласінкі, якімі цяпер апякуецца Марыя Радчук, з'яўляюцца пераможцамі на фестывалях царкоўнай музыкі ў Мінску і Магілёве. Занялі яны першае месца ў Аглядзе калядных калектываў у Тарэспалі. У ГДК спявалі па-царкоўнаму, апранутыя ў белыя блузкі.

Арлянская забудова ☞ 11

Старое мястэчка Орля, сядзіба гмінных улад, мае багатае гістарычнае мінулае. Пачаткі існавання Орлі сягаюць у старажытнасць, доказам чаго з'яўляюцца знойдзеныя тут вырабы з каменя і бронзы.

Запрашэнне

Сергіевіч у Беластоку

24 лютага 2003 г. (панядзелак) а гадз. 18 у Музеі Альфонса Карнага ў Беластоку, вул. Святаянская, 17 адкрыецца выстава карцін Пётры Сергіевіча, якія знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Польшчы.

Арганізатары запрашаюць прыхільнікаў таленту мастака на вернісаж і перапрашаюць за памылковую дату пададзеную ў „Часопісе".

Беларусь — беларусы

Польскія пагранічнікі ў Мінску

У днях 30-31 студзеня ў сталіцы Беларусі з рабочым візітам пабывала дэлегацыя Гранічнай стражы, якую ўзначальваў яе галоўны камендант генерал брыгады Юзэф Клімовіч. У ходзе перагавораў з прадстаўнікамі беларускіх пагранічнікаў, якіх узначальваў старшыня Дзяржаўнага камітэта пагранічных войск генерал-лейтэнант Аляксандр Паўлоўскі, бакі абмеркавалі стан спраў на сумесным участку граніцы і намецілі планы супрацоўніцтва на 2003 год.

Генерал Аляксандр Паўлоўскі адзначыў, што на сённяшні дзень нявырашаных праблем паміж пагранічнікамі абедзвюх краін няма і таму падачс перамоў абмяркоўваліся перш за ўсё пытанні ўзаемадзеяння і планы на будучыню. Кіраўнік польскай дэлегацыі генерал Юзэф Клімовіч таксама станоўча ацаніў стан спраў на польска-беларускай граніцы. Паводле яго, найбольш красамоўным доказам паспяховага ўзаемадзеяння пагранічных служб з'яўляецца адток нелегальных мігрантаў на іншыя ўчасткі мяжы. Шэф польскіх пагранічнікаў адзначыў, што эфектыўнасць дзеянняў беларускіх пагранічнікаў прывяла да таго, што цяпер шляхі для здзяйснення сваіх намераў нелегалы шукаюць ужо на польска-ўкраінскіх рубяжах. Станоўчую ацэнку польскага госця заўважыла прэзідэнцкая газета „Советская Белоруссия", якая інфармацыю аб пабыўцы польскай дэлегацыі надрукавала пад загалоўкам „Пан Климович доволен. Мы тоже".

У мінулым годзе польская-беларускую граніцу перасяклі больш за 10 мільёнаў чалавек і 3 мільёны адзінак аўтатранспарту. Беларускія пагранічнікі затрымалі каля 500 парушальнікаў граніцы і матэрыяльныя каштоўнасці вартыя 630 тысяч долараў.

У сувязі з планаваным увядзеннем Польшчай поўнамаштабнага візавага рэжыму ген. Клімовіч запэўніў, што і пасля 1 чэрвеня г.г. польскія пагранічнікі будуць старацца, каб у перасякаючых мяжу звычайных грамадзян было як мага найменш праблем на граніцы.

Польская дэлегацыя азнаёмілася таксама з працай беларускіх пагранічнікаў у Нацыянальным аэрапорце Мінск і пабывала на факультэце пагранічных войск Ваеннай акадэміі Беларусі.

Рабочая сустрэча кіраўнікоў пагранічных ведамстваў Польшчы і Беларусі закончылася падпісаннем выніковага камюніке. (вл)

Аб назначэнні Э. Хайкена кіраўніком Офіса АБСЕ ў Мінску

30 студзеня г.г. на пасяджэнні Пастаяннага савета АБСЕ дзеючае кіраўніцтва АБСЕ заявіла аб назначэнні прадстаўніка Германіі пасла Эберхарда Хайкена кіраўніком Офіса АБСЕ ў Мінску.

Старшыня Пастаяннага савета АБСЕ Юстус дэ Вісер спецыяльна падкрэсліў, што гэтак неабходнае аператыўнае рашэнне было прынята, у першую чаргу, дзякуючы канструктыўнаму супрацоўніцтву беларускага боку.

Дэлегацыі ЗША, Расіі, Еўрапейскага Саюза, Канады, Нарвегіі і ГУУАМ (Грузія, Украіна, Узбекістан, Азербайджан, Малдова — рэд.) пазітыўна ацанілі назначэнне Э. Хайкена, адзначыўшы, што гэта важны крок на шляху нармалізацыі адносін Беларусі і АБСЕ.

Са свайго боку кіраўнік Пастаяннай дэлегацыі Беларусі ў АБСЕ Віктар Гайсёнак заявіў, што эфектыўнасць і выніковасць будучай працы Офіса АБСЕ ў Мінску ў многім будзе залежаць ад яго кіраўніка. У сувязі з гэтым В. Гайсёнак адзначыў, што беларускі бок шчыра спадзяецца, што Э. Хайкен будзе цесна супрацоўнічаць з урадам Беларусі і ўлічыць памылкі, якія былі дапушчаны былым кіраўніком Кансультатыўна-назіральнай групы АБСЕ ў Мінску Гансам-Георгам Вікам.

В. Гайсёнак таксама падкрэсліў, што дэманструючы канструктыўны падыход у адносінах да ажыццяўлення рашэння Пастаяннага савета № 526, Беларусь чакае, што тыя краіны і інстытуты, якія ўважліва сочаць за сітуацыяй вакол прысутнасці АБСЕ ў Беларусі, ацэняць крокі беларускага боку і ўжо ў бліжэйшы час правядуць пераацэнку сваёй палітыкі ў адносінах да Рэспублікі Беларусь на ўзроўні канкрэтных рашэнняў.

Прэсавы бюлетэнь
Пасольства Рэспублікі Беларусь
у Рэспубліцы Польшча

Змаганне варшаўскіх сялян

[1 ☞ працяг]

ў Заблудаўскай гміне, пражывае ў Беластоку. Яны такія ж землеўладальнікі, як і ніжэйпадпісаны. Маёй зямлі ад 15 гадоў ніхто не араў і нічога на ёй не сеяў. Выраслі на ёй бярозкі і іншыя прыгожыя кусты. Летам бываюць грыбы. Калі б мне плацілі датацыю да маіх чатырох гектараў, тады з эканамічнага пункту гледжання гэтыя грошы былі б змарнаваныя. Таму, што ні я, ні падобныя мне сяляне і так не будуць сеяць пшаніцы паміж кустамі. Найгоршае, што ў маёй, і ў суседніх вёсках увогуле няма сялян, якія маглі б раўняць да еўрапейскіх стандартаў. Большасць жыхароў купляе хлеб і мяса ў крамах за пенсійныя сродкі.

Калі б прынялі да рэалізацыі еўрасаюзны праект падзелу датацыі, можа атрымацца так, што грошай, за якія так заядла змагаліся палітыкі, няма каму раздаць. Тым часам у краіне падрыхтавана толькі палітычная інфраструктура для прыёму еўрасаюзных грошай. Непасрэдная датацыя будзе перамогай палітычнай алігархіі, выступаючай ад імя сялянства. Кароткатэрмінова скарыстаюць таксама сяляне, але напэўна прайграе гаспадарка і ўслед за гэтым пераважная большасць грамадзян краіны.

Яўген Мірановіч

Час раскіданых камянёў

Апошнія дні студзеня ў знешнепалітычным жыцці Беларусі праявілі даволі цікавыя тэндэнцыі ва ўнутранай палітыцы дзяржавы. Як звычайна, адбылося гэта за межамі краіны. У даным выпадку ў Страсбургу на чарговай зімовай сесіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ).

Па вялікаму рахунку ні прыгатаванні да яе, ні яе ход асаблівых сенсацый датычных Беларусі не выклікалі. Як і ў папярэднія разы ў пасяджэнні прымалі ўдзел дзве беларускія дэлегацыі — ад непрызнанай еўрапейцамі Палаты Прадстаўнікоў і ад апазіцыі. Толькі некаторыя члены абедзвюх дэлегацый прысутнічалі на такім форуме ўпершыню. Прычынай гэтага сталася абмеркаванне на пасяджэнні спецыяльнай камісіі ПАСЕ ў справах зніклых у Беларусі. Усё больш актыўна пошукамі сваіх родных — апазіцыйных палітыкаў і бізнесменаў зараз займаюцца іхнія жонкі.

Але асноўнае пытанне, якое ад сесіі да сесіі раз-пораз узнімаецца, гэта, вядома, прызнанне паўнамоцтваў беларускага парламента — Палаты Прадстаўнікоў. Члены гэтага органа ўлады дабіваюцца прызнання яго за сапраўдны парламент здаўна — аж з 1997 года, калі Беларусь была пазбаўлена статусу „спецыяльна запрошанага" ў выніку сумнавядомага рэферэндуму 1996 года, калі папярэдні парламент — Вярхоўны Савет — быў незаконна ліквідаваны прэзідэнцкай уладай. Прайшоўшыя ў 2000 годзе выбары ў Палату Прадстаўнікоў не надалі яму легітымнасці ў вачах Савета Еўропы з-за шматлікіх парушэнняў выбарчага заканадаўства і, як вынік, фальсіфікацый.

Беларускае пытанне было зноў у цэнтры ўвагі еўрапейскіх парламентарыяў, але непасрэдна аб аднаўленні статуса гаворкі не ішло. Размова ў асноўным кранала сітуацыі са свабодай слова. І як аказалася, ніякага прагрэсу з прайшоўшым перыядам не назіраецца. У выніку, зважаючы на абмежаванне волі траім беларускім журналістам, эканамічны ціск на незалежныя газеты і знікненне тэлеаператара Дзмітрыя Завадскага, Беларусь апынулася ў шэрагах еўрапейскіх краін, дзе, як канстатуе Савет Еўропы, існуе гвалт над журналістамі — Арменія, Грузія, Македонія і Украіна. Дагэтуль не прадстаўлены ПАСЕ абяцаны міністрам інфармацыі праект новага закону аб СМІ, які быццам бы ўсё яшчэ знаходзіцца на разглядзе ў прэзідэнцкай адміністрацыі, хаця паказаць яго беларускі бок абавязаўся ў верасні мінулага года.

Што ж тычыцца нейкіх зрухаў у высвятленні абставін знікнення вядомых у Беларусі людзей, то тут таксама ні Савету Еўропы, ні тым больш беларускім праваахоўным органам ганарыцца няма чым. Створаная на папярэдняй сесіі ўзгаданая вышэй камісія на чале з расійскім праваабаронцам Сяргеем Кавалёвым пакуль сур'ёзных вынікаў працы не паказала. Дасланы Кавалёвым адмысловы запыт у следчыя органы ўжо на працягу трох месяцаў застаецца без адказу. Размова з прыбыўшым на сесію былым старшынёй следчага камітэта беларускага міністэрства ўнутраных спраў Л. Глухоўскім паказала, што ўлады не асабліва імкнуцца надаць празрыстасць расследаванню нібыта з-за таямніцы следства, а Палата не можа асабліва шчыраваць у гэтай справе, бо не мае адпаведнай заканадаўчай базы. Цікава, што былы вышэйшы міліцэйскі чыноўнік прапанаваў старшыні камісіі скласці спіс тых асоб, якіх на думку Кавалёва варта апытаць.

Прыбыўшыя ў Страсбург жонкі зніклых вялі сябе больш актыўна. Так, Ірына Красоўская прапанавала Сяргею Кавалёву, які адначасова ёсць дэпутатам расійскай Думы, звярнуцца ў расійскія спецслужбы, каб ад іх атрымаць тую інфармацыю аб пошуках, якую ён ніяк не можа дастаць ад праваахоўных органаў Беларусі.

Актыўная прысутнасць Красоўскай аказалася не даспадобы беларускай афіцыйнай дэлегацыі. На адмысловае запрашэнне членаў Ліберальнай групы ПАСЕ ў рэстаран, што ішло ад кіраўніка дэлегацыі Ул. Канаплёва, еўрапейскія парламентарыі запрасілі і Красоўскую. Па сведчаннях працаваўшых у Страсбургу журналістаў, яе з'яўленне выклікала скандал з боку беларускіх „слуг народа" — яны сказалі, што пойдуць прэч калі гэтая няшчасная, страціўшая мужа жанчына застанецца і будзе прысутнічаць пры размове. Красоўская, зразумела, пайшла, але такое стаўленне да сваіх грамадзян з боку дэпутатаў Палаты не засталося незаўважаным, бо выявіла пагарду маючых уладу чыноўнікаў да свайго народа. Наўрад ці такія паводзіны „парламентарыяў" сведчаць аб дэмакратыі ў Беларусі, тым больш аб агульным зацікаўленні высветліць лёс зніклых.

У той жа час і ў шэрагах апазіцыі знікае пачуццё еднасці інтарэсаў — запрошаны, але не прыехаўшы на пасяджэнне ПАСЕ ад апазіцыі Уладзімір Нісцюк даслаў ліст, што прысутныя там дэмакраты не могуць прадстаўляць усю апазіцыю — хіба толькі свае партыі ці ўвогуле толькі свае асобы. Бо Кансультатыўная Рада апазіцыйных палітычных партый, якая была чымсьці накшталт органа аб'яднанай апазіцыі, зараз страціла двух членаў — БНФ і Партыю камуністаў. Пасяджэнні гэтай самай Рады даўно не адбываліся і склад дэлегацыі на сесію ПАСЕ не вызначаўся.

Такім чынам можна канстатаваць, што як беларускае грамадства, так і беларуская апазіцыя знаходзяцца цяпер у стане моцнага расколу, калі гэта праяўляецца аж „за трыдзевяць зямель". Таму час „збіраць камяні", пра які яшчэ летась у верасні абвесціў А. Лукашэнка, „каб пабудаваць нашу Беларусь", яшчэ не надышоў.

Уладзімір Лапцэвіч

Перагаворы з Польшчай

Увядзенне з пачатку года Польшчай абмежавання на правоз паліва грузавым аўтатранспартам у аб'ёме, які перавышае 200 літраў, абумоўлена маючым адбыцца ўступленнем гэтай краіны ў Еўрапейскі Саюз. У адносінах да беларускіх грузаперавозчыкаў гэта рашэнне не дзейнічае толькі да 3 сакавіка г.г.

Паводле слоў намесніка начальніка ўпраўлення інфармацыі беларускага МЗС Андрэя Савіных, беларускі бок мае намер весці перагаворы з Польшчай па ўнясенні змяненняў у міжурадавае пагадненне „Аб міжнародных аўтамабільных зносінах" ад 1992 года. Гэта даволі доўгі працэс, а яго галоўная мэта — вырашыць пытанне ў цэлым: стварыць такія ўмовы на пагранічных пераходах, каб грузы маглі перамяшчацца максімальна свабодна і за кароткі тэрмін.

Марыя Агафонава, Белта

Управа ідзе крок назад

Ваяводскі кантракт будзе паўторна абмяркоўвацца Міністэрствам гаспадаркі. Такую заяву зрабіў падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі.

Ваяводскі кантракт гэта своеасаблівая дамова, якая датычыць супольнага фінансавання з урадам некаторых інвестыцый і праектаў. Сёлета Падляшша мае атрымаць з цэнтральнага бюджэту 16 мільёнаў злотых. Кантракт у актуальным кшталце заключылі папярэднія правыя ўлады са Славамірам Згжывам на чале (сёння віцэ-старшынёй Сейміка), пры адабрэнні Сейміка здамінаванага Выбарчай акцыяй „Салідарнасць" і саўдзеле правых паслоў, сярод якіх найактыўную ролю адыгрываў Кшыштаф Юргель (тады — Паразуменне Цэнтр, цяпер — Права і Справядлівасць). Сённяшняя левая ўправа хоча больш на 4 мільёны зл. прызначыць на інвестыцыі.

— Я хачу, каб сродкі, асабліва тыя, што паходзяць з Нацыянальнага фонду падтрымкі, цэнтральнага бюджэту, былі накіроўваны на развязку найбольш неабходных мэт, — запэўніваў на прэс-канферэнцыі маршалак Кшыжэўскі.

Сярод тых мэт: разбудова школ у Сямятычах, мадэрнізацыя павятовых дарог і будынкаў дамоў сацыяльнай апекі, а таксама рамонт франтона Беластоцкай філармоніі і Драматычнага тэатра ў Беластоку.

Януш Кшыжэўскі і член ваяводскай управы Караль Тыленда інфармавалі таксама аб адмяненні аўкцыёна на г.зв. „інфарматычную сістэму ўспамагання кіравання ваяводствам". Справа ў вылучэнні папярэдняй управай фірмы, якая мела заняцца закладкай сеткі камп'ютэраў у Маршалкоўскай управе і падрыхтоўкай праекта „Інфармацыйнае грамадства" (нашага рэгіёна), а які быў бы падставай здабывання грошай з Еўрасаюза. Як сцвердзіў Караль Тыленда, аўкцыён (вартасці 5 млн. зл.) быў праведзены нязгодна з Законам аб публічных заказах, што пацвердзіў старшыня Установы публічных заказаў і загадаў нанава разгледзець прапановы. Тыленда тлумачыў, што ўдзельнікі аўкцыёна м.інш. завысілі ў прапановах удзел польскіх вырабаў. Апроч таго, папярэдняя ўправа пагадзілася ўтрымаць адно з сецыўных інфарматычных спалучэнняў даражэйшае ў чатыры разы чым у іншых прапанаваных. Дарыюш Цішэўскі, падляшскі віцэ-маршалак папярэдняй кадэнцыі, у той час адказны за пытанні звязаныя з аўкцыёнам, усе „ўнушэнні" аб няправільнасцях назваў „татальнай бязглуздзіцай", прытым яшчэ на два дні да прэс-канферэнцыі членаў новай управы. У сваю чаргу Караль Тыленда запэўніваў: „Грошы будуць выдаткоўвацца больш разумна".

Пры нагодзе прэс-канферэнцыі стала вядомым, што сумненні новай управы выклікае ўдзел Падляшша ў Канферэнцыі перыферыйных надморскіх рэгіёнаў, да якое наша ваяводства далучылася перад апошнімі самаўрадавымі выбарамі. Гадавая складчына ў гэтай арганізацыі — 25 тысяч злотых. А яшчэ і папярэдні маршалак Славамір Згжыва абавязаўся арганізаваць у Беластоку канферэнцыю балтыйскай камісіі таго аб'яднання, аплаціць закватараванне і харчаванне яе ўдзельнікаў. Калі выходзіць гэты нумар „Нівы", сустрэча мела ўжо адбыцца.

— На спатканні спрабуем адказаць на пытанне, ці варта быць членам гэтае арганізацыі, — раней сцвердзіў маршалак Кшыжэўскі.

У Канферэнцыю ўключаны 150 еўрапейскіх рэгіёнаў. Яе супольны клопат — выкарыстанне рэсурсаў мора і лініі пабярэжжа. Падляшша летась за далучэнне да Канферэнцыі было ўзнагароджана „Выбарчай газетай" „Залатым унітазам" за найбольш абсурдную ідэю ўлады.

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Канферэнц-зала магістрата запоўнілася прадаўцамі, гандлярамі і прадпрымальнікамі (бурмістр Анатоль Ахрыцюк першы злева

Мы не хочам супермаркета

Каля 200 уласнікаў магазінаў, прадпрымальнікаў і працаўнікоў гандлёвай арганізацыі ПСС „Сполэм" з Гайнаўкі 31 студзеня пратэставалі ў магістраце супраць праекта будовы супермаркета ў цэнтры горада — паміж вуліцамі Баторыя і 11 Лістапада. 14 студзеня на аўкцыёне гектарны ўчастак зямлі купіла пад будову магазіна варшаўскае прадпрыемства. Раней купіла яно ад Дрэваапрацоўчага прадпрыемства „Фурнель" суседні ўчастак велічынёй 400 квадратных метраў. Продаж гарадскога ўчастка не замацавана яшчэ натарыяльным актам і гайнаўскія прадаўцы стараліся схіліць бурмістра Анатоля Ахрыцюка да адмены рашэння аб продажы.

Бурмістр з цяжкасцю прабіраўся праз натоўп людзей, якія сабраліся ў канферэнц-зале магістрата і на калідоры. Бурмістру спатрэбілася гукаўзмацняльная апаратура, каб усе маглі пачуць яго аргументацыю. Такой мабілізацыі гайнавян не было ад часу пратэсту супраць спробы пашырэння нацыянальнага парку на ўсю Белавежскую пушчу.

— У Польшчы не забараняецца будаваць магазіны плошчаю да 2 тысяч квадратных метраў, а на купленай тэрыторыі плануецца збудаваць супермаркет размерам 1 990 квадратных метраў. Дэталі будуць вырашацца перад падпісаннем натарыяльнага акту, — адказаў бурмістр. — У першую чаргу хацелі мы даць шанц гайнаўскім гандлярам і таму прадалі ўчастак ПСС „Сполэм". Ужо на сёлетнія Каляды меў стаяць магазін, але гэтая інвестыцыя не здзейснілася.

Бурмістр пераконваў, што будова супермаркетаў у такіх гарадах як Гайнаўка — справа непазбежная і трэба з гэтым змірыцца. Паінфармаваў, што чарговы інвестар хоча таксама ў цэнтры горада будаваць вялікі магазін. Аднак улады горада не згаджаюцца на гэтую інвестыцыю.

— Калі ўзнікне вялікі супермаркет, працу страціць у Гайнаўцы 300 асоб, а прымуць у новы магазін 30 чалавек. Будуць гэта маладыя дзяўчаты, якім заплацяць па 500 злотых у месяц, бо старэйшых асоб не захочуць прымаць. А хто тады будзе прадаваць польскія прадукты? — пыталася пажылая жанчына са „Сполэм". — Вы, бурмістр, прыцягніце ў горад прадпрымальніка, які адкрые прадпрыемства і створыць новыя месцы працы. Працаўнікі „Сполэм" у выбарах галасавалі на вас і чакаем, што будзеце нас бараніць.

Прысутныя абвінавацілі бурмістра ў тым, што аўкцыён праходзіў 14 студзеня, калі праваслаўныя жыхары горада святкавалі Новы год.

— Мы не хочам супермаркета, — пачалі крычаць уголас сабраныя і перабіваць выказванні бурмістра. — Прадстаўляецца нам перспектыва будовы супермаркета, калі магазіны ў горадзе не даюць прыбытку.

Старшыня ПСС „Сполэм" Мечыслава Багдановіч патлумачыла, што яе фірма не распачала будовы вялікага магазіна, бо цяжка было сабраць адпаведныя сродкі. Перашкодзіла таксама падрыхтоўка да перабудовы вуліцы Баторыя.

— Выканалі мы ўжо праект і збіраліся абвяшчаць аўкцыён на вылучэнне выканаўцы інвестыцыі, аднак не ведаем, што рабіць, бо мы не ў змозе змагацца з замежным капіталам, — сказала Мечыслава Багдановіч. — Магазін, гандлёвая плошча якога складзе каля 700 квадратных метраў, будзе каштаваць каля 1 мільёна долараў.

— У Гайнаўцы звыш 20 тысяч пакупнікоў, а многія ездзяць за пакупкамі па-за Гайнаўку, у Беласток. Заахвоцце іх, каб куплялі ў горадзе, — гаварыў бурмістр Анатоль Ахрыцюк. Абвінавачыў ён гайнаўскіх прадпрымальнікаў у тым, што дазваляюць прадпрыемствам з Бельска-Падляшскага адкрываць філіялы ў Гайнаўцы і развіваць у горадзе дзейнасць.

Паводле прысутных, супермаркет стане прычынай звальненняў работнікаў у прадукцыйных прадпрыемствах, бо тавары ў новы магазін будуць завозіцца з вялікіх оптавых складоў. У выніку ў горадзе пабольшае беспрацоўе. Бурмістр пераконваў, што ў новым магазіне знойдуць працу многія гайнавяне. Атмасфера ў канферэнцыйнай зале рабілася штораз больш гарачай. Маючы на ўвазе патрабаванні прысутных бурмістр паабяцаў працаўнікам „Сполэм": „Зраблю ўсё, каб не ўзніклі іншыя супермаркеты".

Сабраныя дамовіліся аб стварэнні ў горадзе Гайнаўскага саюза купцоў і прадпрымальнікаў. Калі ў Бельску ўзнікне супермаркет або некалькі (вядзецца падрыхтоўка да гэтага), гайнавяне пачнуць ездзіць за таннейшымі прадуктамі ў суседні горад. Справу можа выратаваць маркет мясцовага ПСС „Сполэм", калі прадукты будуць таннейшымі ад тых, якія прадаюцца ў магазінах сёння.

Аляксей Мароз

Інстытут Белавежскай пушчы шукае партнёраў

У Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы мае сваю сядзібу бюро Таварыства аховы Белавежскай пушчы (ТАБП). Старшыня ТАБП д-р інж. Анджэй Бобец заснаваў Інстытут Белавежскай пушчы. Сёлета ў Нараўцы пачнуць навуку студэнты. Будуць весціся заняткі па экалогіі лесу, ахове прыроды, а таксама традыцыі і культуры жыхароў пушчанскіх вёсак.

Белавежскай пушчай зацікаўлены шматлікія любіцелі прыроды, біёлагі і эколагі на свеце. Яна — апошні натуральны лес на нізоўі ўмеркаванай зоны ўсяго паўночнага паўшар'я.

Чаму ІБП у Нараўцы? Між іншым таму, што адсюль недалёка знаходзіцца Нацыянальны парк, тут ёсць добрае камунікацыйнае спалучэнне, прыгожы краявід, традыцыйная забудова шматлікіх вёсак, шматвяковая традыцыя.

На лекцыях па культурнай спадчыне пушчанскага грамадства запланаваны заняткі па разьбе на дрэве, ткацтве, ракітапляценні ды традыцыйнай кухні. Патрэбны будуць інструктары — народныя ўмельцы. Неабходна будзе раскватараваць студэнтаў. Пажаданым было б у прыватных дамах, у агратурыстычных кватэрах. ІБП запрашае тады да супрацоўніцтва інструктараў і жыхароў з вольнымі кватэрамі.

Янка Целушэцкі

Прыязныя асяроддзю

Нядаўна падсумавалі вынікі IV выпуску Конкурсу „Прыязныя асяроддзю". Конкурс арганізуе ўжо ад чатырох гадоў Таварыства Еўропа Наш Дом. Сёлета ўпершыню ўзнагароду атрымала Нараўчанская гміна за паспяховую рэалізацыю праграмы каналізацыі вёсак і пабудову ачышчальні сцёкаў у Старым Ляўкове.

— Узнагарода ў 20 тысяч злотых будзе дастатковай, каб разбудаваць каналізацыйную сетку на беразе Семяноўскага вадасховішча, — сказаў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

Урачыстасць уручэння ўзнагарод для пераможцаў экалагічнага конкурсу адбылася 3 лютага ў калонным зале Сейма РП у Варшаве. (яц)

Сэрца Беларусі

Вось, я доўга збіраўся да гэтага моманту, калі пачну пісаць аб гэтым для мяне, але і не толькі, найдаражэйшым горадзе. Канешне, бывае вельмі сумна, калі хтосьці выказваецца дрэнна пра месца, да якога ты „прырос" сэрцам. Канешне, аб праблемах трэба гаварыць. Але нават гаварыць, гэтага мала. Трэба дзейнічаць. Найгоршае тое, што часам людзі не заўважаюць добрага, таго, што з'яўляецца рухавіком чалавечага жыцця. Вось, для мяне, можа не на першым месцы, але ўсё ж такі важным, ёсць мая Радзіма ў Радзіме — Мінск.

Горад гэты адзін са старэйшых у Беларусі (найстарэйшы — Полацк). Першы раз успамінаецца ў 1067 годзе ў славутых „Повесці мінулых гадоў" і ў „Слове пра паход Ігаравы". Гэта пад тагачасным Менскам на рацэ Няміга адбылася вельмі крывавая бітва паміж полацкімі і кіеўскімі дружынамі. Нават амаль сто гадоў пазней напісанае „Слова пра паход Ігаравы" кажа: „На Немиге снопы стелют головами, молотят цепями булатными, на току жизнь кладут, веют душу от тела, у Немиги кровавые берега не добром были посеяны — посеяны костьми русских сынов". Канешне, Няміга нешчаслівае месца. У 1999 годзе ў пераходзе метро загінулі 53 асобы. Сёння на гэтым месцы два помнікі — адзін у форме маленькай капліччкі з крыжам, на якой напісаны прозвішчы ўсіх тых, што загінулі. Другі — у форме сходаў, на якіх уніз галоўкамі ляжаць кветкі (ружы сімвалізіруюць жанчын, цюльпаны — мужчычн). Усе гэтыя кветкі пераломаны. Яшчэ да нядаўняга часу на сценах гэтага перахода віселі вершы, здымкі. Сёння ўжо іх няма. Можа гэтая каплічка іх замяніла...

Вось, гэта толькі некалькі трагічных старонак сталічнага горада.

А сёння рака Няміга амаль не існуе — або высахла, або „заключана" ў трубу праходзіць пад вуліцай з той жа назваю. Шкада, што і вуліца не нагадвае ўжо тых старых часоў. Калісьці (яшчэ пасля вайны) існавала тут старадаўняя пабудова. На жаль, дзесьці пад канец 60-х, у пачатку 70-х гадоў яе разбурылі і пабудавалі шматпавярховы жылы дом з гандлёвым магазінам. Сёння, каб не „пуджаць" шматпавярхоўцамі ўначы падсвятляецца толькі гандлёвы дом (трэба сказаць, што робіць уражанне!), а „жылой сцяны" амаль не відаць. На шчасце засталася тут Петрапаўлаўская царква пачатку XVII стагоддзя (на здымку). Сёння яна дзейнічае (раней была падзелена і знаходзіўся тут архіў). Унутры можна ўбачыць фрагменты роспісу.

Па другім баку вуліцы цяпер вядуцца археалагічныя раскопкі. Тут знаходзілася, між іншым, пякарня. Шкада толькі, што на гэтым месцы ёсць праект пабудовы аўтастаянкі. Ёсць розныя погляды на гэтую тэму. Некаторыя кажуць, што старая вуліца Няміга сёння знаходзіцца пад жылым домам і магазінам, а на месцы, дзе хочуць будаваць паркінг былі гаспадарчыя пабудовы.

Непадалёку ад Петрапаўлаўскай царквы знаходзіцца Плошча 8 Сакавіка, месца старажытнага замчышча Менеск (Менск). Тут (за спартыўнай залай) абазначана месца, дзе знаходзяцца падмуркі царквы XII стагоддзя. А ёсць таксама версія, што яна ніколі не была выбудаванай да канца (пры даследаваннях не выяўлена верхніх частак сцен і даху). Трошкі далей знаходзіцца макет падмуркаў гэтай царквы. Апавядаць пра гэты горад можна яшчэ шмат.

Аляксей Дзядак

Вачыма паляка

І зноў багна

Ізноў герой гэтай рубрыкі, пасол Лігі польскіх сем'яў Анджэй Фэдаровіч стаў тым, на каго звярнуліся вочы публікі. І то зусім не з прычыны свае пахвальнае дзейнасці, а чарговых раз'ядаючых выказванняў. Ужо раз з сеймавай трыбуны пасол Фэдаровіч выказваўся, хоць не даказваў, што нацыянальных меншасцей, у тым і беларускай, у Польшчы няма. Усё адбывалася ў час дэбаты над законам аб нацыянальных меншасцях. У гэты раз — у час публічнай дыскусіі ва Універсітэце ў Беластоку, пры задавальненні сваіх паплечнікаў, распавядаў: „Я — талерантны, бо не забіў ні аднаго жыда ні педзіка", „няма беларускай меншасці, ёсць толькі праваслаўныя палякі".

Некалькі дзён па гэтых выказваннях і пратэстах маладзёжнай арганізацыі ад Уніі працы (накіраваных маршалу Сейма), Анджэй Фэдаровіч стаў пярэчыць, што не сказаў таго, што сказаў. Прытым не здзівіла яго атака на ўласную асобу, бо, як тлумачыў, „вяртаюцца сталінскія часы".

Справа трапіць, праўдападобна, у сеймавую Камісію па справах дэпутацкай этыкі, што можа закончыцца толькі напамінкам, і ў выніку ўзмоцніць падляшскага пасла ў яго поглядах, паможа стаць яму мучанікам у барацьбе за польскасць і каталіцызм. Нішто яго не зменіць, і не змоўкне ён у агалошванні сваіх думак да таго часу, пакуль частка грамадства (дарэчы, невялікая) будзе аддаваць на яго свой выбарчы голас. Так будзе датуль, дакуль ягоныя „роздумы" не сустрэнуцца з асуджэннем, не будуць зганены грамадствам, з якога ён выводзіцца: правіцай і Каталіцкім касцёлам. Пакуль што, ні на адно, ні на другое няма чаго разлічваць.

Што цікава, пасол Фэдаровіч прызнаецца ў актыўнай дзейнасці ў структурах першай „Салідарнасці", у тым падпольнай у час ваеннага становішча. Не быў ён, праўда, інтэлектуальным маторам незалежнага прафсаюзнага руху на Беласточчыне, а друкаром. Усё ж, быў з „Салідарнасцю" блізка звязаны. Шукаючы тлумачэння яго адносін да меншасцей, а, папраўдзе, іх браку, бо ж, на яго думку, меншасцей у Польшчы няма, трапіў я на публікацыю Тамаша Данілецкага ў найноўшым Інфармацыйным бюлетэні Інстытута нацыянальнай памяці. Піша ён: „Дзеячы „С" не хацелі адабраць дзейнасці беларускай інтэлігенцыі, мэтай якой было стварыць свядомую, незалежную і згуртаваную беларускую меншасць у Польшчы". Ну, бо як жа ж маглі, калі паводле тагачасных дзеячаў „Салідарнасці", як і сённяшнага пасла ад Лігі польскіх сем'яў Фэдаровіча, тае меншасці няма.

Чытаючы публікацыю Данілецкага, я зразумеў, што ў падставе мышлення пана Фэдаровіча (і да яго падобных) адбіваецца часта стэрэатып ментальнасці асабліва правай экстрэмальнай часткі палякаў аб беларусах у Польшчы. Зводзіцца ён да таго (паўтарае гэта нават Польскае прэсавае агенцтва), што „за паваенныя 50 гадоў беларусы падмацоўвалі кадры МО, УБ, ПАРП, а перш за ўсё захоўвалі маўклівае падданства ў адносінах да ўлад". Так, вось, у прымітыўным спрошчанні, у галовах панаў Фэдаровічаў усе беларусы былі катамі, што мучылі польскіх патрыётаў (праціўнікаў камунізму) або калабарантамі рэжыму. Як было ў сапраўднасці і чаму і дзе ляжыць праўда, асабліва старэйшым чытачам „Нівы" не трэба тлумачыць. Другое, і, мабыць, важнейшае пытанне гэта разладдзе паміж Царквой і Касцёлам. „Панове Фэдаровічове" ў дзейнасці падкрэсліваюць свае блізкія сувязі з Рымска-каталіцкім касцёлам, яго навукай і палітыкай. І незалежна ад таго, што ў апошні час на ўзроўні абодвух лакальных касцёлаў нават даходзіць да супольнага ўдзелу іерархаў у рознага роду мерапрыемствах, здавалася б, адносін нармальных, гэта толькі від. Найважнейшыя пытанні, як справа мешаных сужонстваў, застаюцца нявырашанымі. Глабальна, яшчэ больш пякучыя праблемы не вырашаюцца на ўзроўні кіраўнікоў Царквы і Касцёла, не кажучы ўжо пра немач у паразуменні паміж Ватыканам і Маскоўскім патрыярхатам. Таму пасол Фэдаровіч ахвотней бачыў бы не беларусаў, а „выключна праваслаўных у Польшчы". Гэта таму, каб каналізаваць ворага, лягчэй яго назваць і паказаць на пытанні, апраўдаць неабходнасць абароны веры, а прытым польскасці. Добра прыслугоўваюцца мысліцельным вылазкам „панаў Фэдаровічаў" нярэдкія дзеянні і выказванні прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. От, хоць бы такія, як у час апошняга спаткання прэзідэнтаў СНД у Кіеве, на якім старшынства над арганізацыяй абняў украінскі прэзідэнт Леанід Кучма. Беларускі шэф дзяржавы выказаўся адназначна, што ні Беларусь, ні іншыя дзяржавы СНД не падтрымліваюць і не падтрымаюць збройнай інтэрвенцыі на Ірак, што ў Беларусі ёсць свой інтарэс у супрацоўніцтве з краінай Садама Гусейна. Урэшце, прэзідэнт Лукашэнка заявіў пра сваю абсалютную ўпэўненасць у тым, што ў Іраку няма зброі масавага знішчэння. Такія выказванні ў паслу Фэдаровічу і яму падобных, незалежна ад таго, што яны думаюць пра Ірак і інтэрвенцыю, могуць толькі ўзмацняць пачуцці ўласнай варожасці да Беларусі, а затым, у іх спрошчаным мышленні — варожасці і да беларускай меншасці ў Польшчы. Абавязвае тут г.зв. калектыўная адказнасць?

Застаецца мець надзею, што Польшча несумненна ўвойдзе ў Еўрасаюз, што яе грамадзяне ў рэферэндуме аддадуць голас на „так" і не паддадуцца звесціся спробам ізаляцыі нашай краіны, калі маглі б застацца мы на ўласным сметніку, соусе, багне нацыяналізмаў, шавінізмаў і ксенафобіі, як гэтага хочуць панства з такіх партый як групоўка Анджэя Фэдаровіча.

Мацей Халадоўскі

PS. З апошняй хвіліны: справай выказвання пасла А. Фэдаровіча занялася раённая пракуратура.

Знаёмства з гісторыяй малой айчыны

У VII семінары „Падляшша", які з 20 па 22 снежня 2002 года праходзіў у Дубічах-Царкоўных, Драгічыне і Мельніку прынялі ўдзл гайнаўскія і бельскія белліцэісты. Мэтай семінара, арганізаванага Беларускім саюзам у РП і Клубам беларускіх спраў „Граблі", які дзейнічае пры Гайнаўскім белліцэі, было азнаямленне з гісторыяй і архітэктурай паўднёвай часткі Падляшша.

Першага дня моладзь сустрэлася з кіраўніком семінара, настаўнікам гісторыі ў Гайнаўскім белліцэі Яўгенам Янчуком. Пазнаёміў ён удзельнікаў з праграмай мерапрыемства і расказаў пра гісторыю Драгічына і Мельніка. Другога дня моладзь наведала Драгічын і пазнаёмілася з архітэктурай касцёлаў і царквы — унікальнай на Падляшшы. У Мельніку вучні пабачылі Замкавую гару, руіны замка, пазнаёміліся з ідэяй Мельніцкай уніі. Семінар закончыўся падвядзеннем вынікаў у Дубічах-Царкоўных.

— Выезд зацікавіў моладзь, якая хоча знаёміцца з гістарычнымі помнікамі Падляшша. Мы многа ведаем аб вялікай айчыне, а мала аб малой. Гісторыя малой айчыны можа быць намнога цікавейшай ад вялікага мінулага. Яна звязаная з нашымі продкамі і іх землямі. Калі мы думаем, што на Падляшшы не праходзілі вялікія падзеі, то памыляемся. Прыкладам можа быць Студзеньскае паўстанне і Мельніцкая унія, — адзначыў кіраўнік семінара Яўген Янчук. (ам-з)

Праца, хобі і прыгода на ўсё жыццё

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Размова з Наталляй ГЕРАСІМЮК — бібліятэкаркай Беларускага музея ў Гайнаўцы.

— Раскажыце ў некалькіх словах пра сябе.

— Нарадзілася я і вырасла ў Беларусі. Пасля заканчэння Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А.С. Пушкіна пяць гадоў працавала настаўніцай у Высокаўскай сярэдняй школе. У 1993 годзе лёс закінуў мяне ў Гайнаўку, дзе і жыву дагэтуль.

— Як Вы сталі кіраўніком бібліятэкі пры Беларускім музеі?

— Ідэя стварыць беларускую бібліятэку прыйшла тады, калі падгадаваўшы дзяцей вырашыла я заняцца чымсьці карысным для сябе і суайчыннікаў. У лістападзе 1997 года запрапанавала стварыць бібліятэку пры Музеі і асяродку беларускай культуры і ўжо ад снежня пачала працаваць. Шчыра кажучы, бібліятэка ад пачатку да сённяшняга дня — маё дзіця, якое люблю і лілею, якое стварыла я амаль з нічога. Гэта праца, хобі і прыгода на ўсё жыццё.

А пачыналася так. У адным з памяшканняў Музея стаялі шафы, у якіх у бязладдзі было згружана каля тысячы кніжак, якія ў свой час былі прывезены з Беларусі. Не было ні эвідэнцыі, ні картатэкі. Вось і ўзялася я ўпарадкаваць гэту звалку, зрабіць сапраўдную бібліятэку, тым больш, што патрэба ў ёй была вялікая. Два месяцы парадкавала зборы, адначасова вучылася ў спецыялістаў з гарадской бібліятэкі весці дакументацыю, эвідэнцыю, каталогі. Сёння кнігазбор налічвае больш васьмі тысяч асобнікаў і ўвесь час папаўняецца новымі набыткамі.

— Якім чынам папаўняецца кнігазбор?

— Першае, што прыйшло мне ў галаву — зрабіла перагляд хатняй бібліятэкі. Мая мама працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Большасць зароблены грошай траціла яна ў кнігарнях. Калі мама адышла на пенсію, уся метадычная літаратура стала ёй непатрэбнай, а ў Гайнаўцы адчуваўся недахоп менавіта такой літаратуры. Вось і паехалі маміны кнігі, планы, распрацоўкі ў нашу бібліятэку. Але гэтага было недастаткова. Пачала я пісаць пісьмы-звароты ў раённыя, абласныя газеты Беларусі з просьбай перадаваць нам кнігі, часопісы, газеты. І пачалося. У збор кніг уключыліся Метадычны кабінет беларускай мовы і літаратуры ў Камянцы, Высокаўская сярэдняя і санаторная школы, Інстытут удасканалення настаўнікаў у Брэсце, Брэсцкі універсітэт, рэдакцыя газеты „Народная трыбуна" і прыватныя асобы. Рознымі шляхамі траплялі гэтыя зборы ў нашу бібліятэку, але большасць іх праз мяжу перавозіла я сваім самаходам. Мытнікі неаднойчы круцілі пальцам ля скроні, каментуючы мой багаж: „Іншыя вязуць гарэлку і цыгарэты, а гэтая ненармальная кніжкі валачэ. Есці яна іх будзе, ці што?!" Пыталіся колькі мне выходзіць „na czysto". Спачатку смяяліся, а пасля прывыклі і ўжо не здзіўляла іх скрыня з „nietypowym towarem" у багажніку майго самахода.

Пісала я не толькі ў Беларусь, але і ў Амерыку, Аўстралію, Нямеччыну. Адусюль мне аказвалі падтрымку. Беларусы ў Польшчы таксама не асталіся збоку. Шмат кніг перадаюць рэдакцыя тыднёвіка „Ніва", Беларускі саюз у Польшчы, літаратурнае аб'яднанне „Белавежа". Пасля смерці Міколы Гайдука жонка пісьменніка перадала нам ягоную бібліятэку з архівам, які стаў каштоўным набыткам. На Гайнаўшчыне пачалі ліквідаваць школы і беларускія кнігі са школьных бібліятэк таксама трапляюць да нас. Вялікую дапамогу аказвае Генеральнае Консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку.

Новыя кнігі, якія выдаюцца ў Беларусі, таксама трапляюць у нашу бібліятэку. Большасць з іх купляю я сама ў кнігарнях Брэста, Гродна, Мінска, калі пры нагодзе наведвання бацькоў бываю на Радзіме.

— Хто фінансіруе пакупку кніг?

— Спачатку ўсе закупленыя кнігі аплачваліся Грамадскім камітэтам пабудовы музея і асяродка беларускай культуры. Пасля сказалі, што „грошай няма, ды і кніжак ужо хопіць". Але практыка паказвае, што не хапае, ды і што гэта была б за бібліятэка, якая не папаўняла б свае зборы навінкамі? Таму працягваю купляць кнігі за свае грошы. Магчыма, калі фінансавая сітуацыя Камітэта палепшыцца, мне вернуць кошты кніг, а калі не, то і так застанецца. У сённяшняй сітуацыі нельга чакаць з пакупкай кніг да тае пары, калі паявяцца грошы, таму, што вартасныя кнігі выходзяць малым тыражом і вельмі хутка разыходзяцца. Калі не набуду тую ці іншую кнігу сёння, то праз месяц, каб яе здабыць, трэба будзе заплаціць удвая ці ўтрая даражэй, калі ўвогуле ўдасца яе знайсці. Таму стараюся не прапусціць, купляю за свае, а там пабачым...

— Якім чынам рэалізуецца запатрабаванне на кнігі, якіх няма ў Вашай бібліятэцы, але якія патрэбны чытачам?

— Па-рознаму. Калі кнігу, патрэбную чытачу, маю ў сваёй бібліятэцы, то прыношу і пазычаю. Калі не маю такой, еду ў Беларусь і шукаю ў кнігарнях. Ёсць — купляю. Няма — іду ў школьныя бібліятэкі, у бібліятэку Універсітэта, або ў абласную імя М. Горкага ў Брэсце і там пазычаю на сваё прозвішча. Прывожу іх у Гайнаўку і чытач мае тое, што яму трэба. Неаднойчы бывае так, што студэнты, якія паехалі вучыцца ў вышэйшыя ўстановы Гродна ці Мінска, шукаюць патрэбную ім літаратуру ў нас і атрымоўваюць яе, пазычаную мною ў Брэсце.

— Як Вы супрацоўнічаеце з настаўнікамі беларускай мовы?

— Мы запрасілі ўсіх настаўнікаў беларускай мовы з Гайнаўкі, Бельска і ваколіц на канферэнцыю, каб пазнаёміць іх з кнігазборам, распавесці пра свае планы і даведацца, што найбольш патрэбнае ім у іх працы. І ўжо суадносна з іх патрэбамі і патрэбамі вучняў, камплектую зборы нашай бібліятэкі. Апрача кніг яны могуць карыстацца газетамі, часопісамі, распрацоўкамі і сцэнарыямі святаў, ранішнікаў, віктарын, якія ўкладаюць настаўнікі і навукоўцы ў Беларусі. Дапамагаю выбраць рэпертуар на конкурсы і выступленні. У бібліятэцы адбываюцца ўрокі, сустрэчы, літаратурныя спатканні. Некалькі гадоў запар арганізавала я навагоднія ранішнікі для вучняў падставовых школ Гайнаўскага павета, якія вывучаюць беларускую мову.

— Вы былі арганізатарам выезду настаўнікаў беларускай мовы ў Беларусь.

— Часта чула нараканні настаўнікаў, што калісьці яны ездзілі на курсы ў Мінск, але ўжо шмат гадоў ніхто іх нідзе не запрашае. Школа цісне, каб настаўнікі павышылі кваліфікацыю, але няма магчымасці гэта зрабіць.

Дзякуючы маім асабістым кантактам і сябрам, Брэсцкаму аблвыканкаму і Інстытуту ўдасканалення настаўнікаў такі выезд стаў магчымым. У кастрычніку 2001 года група настаўнікаў цэлы тыдзень пабывала ў Беларусі. Ды толькі і пры гэтым мерапрыемстве не абышлося без непаразуменняў. На 20 запрошаных асоб з цяжкасцю назбіралася 12, я была трынаццатай. Частка настаўнікаў не мела пашпартоў, хаця пра выезд ведалі яшчэ ў маі. Частка не хацела з няведамых прычын. А тых, хто хацелі, не пусцілі дырэктары школ ці гмінныя ўлады. І вось гэтага я не разумею: настаўнікі ехалі на ўласны кошт, з падменай дамовіліся між сабою, што адзін аднаго заступіць. Ні школа, ні гміна не далі на курсы павышэння кваліфікацый ані адной залатоўкі і не дазволілі на выезд, матывуючы, што гэта дэзарганізуе працу школы. Нейкае памылковае кола: мы патрабуем, але рабіць не дазволім! Дзе логіка? Тыя, што паехалі, напэўна не шкадуюць ні страчаных грошай, ні страчанага часу. Праграма была вельмі насычаная і напружаная. На працягу тыдня настаўнікі наведалі каля двух дзесяткаў школ Брэста і Брэсцкай вобласці, пабывалі на ўроках, на адкрытых мерапрыемствах. Настаўнікі пазналі новыя метады і формы працы з вучнямі, адным словам, павысілі сваю кваліфікацыю.

— А як працуеце з моладдзю?

— У ліпені 2000 года ездзіла я з вучнямі ў краязнаўча-этнаграфічную экспедыцыю. 20 вучняў з апекунамі тыдзень падарожнічалі на роварах па ваколіцах Гайнаўкі. Сустракаліся мы з цікавымі людзьмі, пазнавалі старыя рамёствы, малявалі, збіралі фальклор і экспанаты для музейных выставак. Пасля на працягу двух тыдняў апрацоўвалі сабраныя матэрыялы. Спонсарам экспедыцыі была гарадская ўправа.

У 2001 годзе з вучнямі белліцэя і Падставовай школы № 6 у Гайнаўцы з тэатральнай пастаноўкай „Кароль Ірад" выступалі ў дамах сацыяльнай дапамогі ў Гайнаўцы і Белавежы, у шпіталі, у вясковых клубах Нараўкі і Старога Ляўкова.

У лістападзе мінулага года вазіла я вучняў гайнаўскіх падставовых школ на трохдзённую экскурсію ў Беларусь. Дзеці наведалі Высокае, Брэст, Камянец і Каменюкі. Апрача вышэйсказанага арганізую я сустрэчы, віктарыны, святы з удзелам вучняў і для вучняў.

— У будынку ГКПМіАБК ёсць кіназал. Чаму ў ім не паказваюць беларускія фільмы?

— Нельга сказаць, што не паказваюць. Быў час, калі паказвалі, што праўда нядоўга. Некалькі гадоў таму, згодна з дамовай з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, якое перадало музею кінаапаратуру, Брэсцкі кінавідэапракат пазычаў нам фільмы для агляду. Пазычалі неадплатна, але пытанне перавозу фільмаў праз мяжу асталося нявырашаным. З часам і гэту праблему ўдалося вырашыць. Раз у два тыдні, у вольны ад работы дзень, ездзіла я ў Брэст, пазычала па 2 фільмы для агляду. Праз два тыдні абменьвала на наступныя. Так працягвалася некалькі месяцаў, а пасля аказалася, што „няма ахвотных глядзець гэтыя фільмы". Тым не менш, у нашу відэатэку, якую збіраю ў бібліятэцы, час ад часу трапляюць беларускія фільмы на відэакасетах, якімі карыстаюцца настаўнікі беларускай мовы на сваіх уроках. Частку гэтых касет атрымліваю ў падарунку ад сваіх сяброў з Брэсцкага кінавідэапракату, частку купляю сама. Ведаю, што мае сябры гатовяць нам вялікі падарунак. Падазраю, што будуць гэта копіі большасці беларускіх фільмаў, якія перададуць нам ва ўласнасць, каб мы маглі заўсёды ў патрэбную хвіліну паглядзець фільм, які нас цікавіць.

— Пачаўся 2003 год. Што Вы зычыце сваім чытачам і сабе?

— Па-першае, здароўя. Па-другое, спакою і дабра ў жыцці. Цікавых планаў, мараў і — галоўнае — магчымасці іх здзяйснення!

— Дзякую за размову.

Гутарыў Віктар БУРА

Развітанне са Збышкам Вайдыкам

Няма ўжо спадара Збігнева Вайдыка, вядомага паэта, фрашкапісца, аўтара афарызмаў. Сябры жырналістаў, паэтаў-аматараў, беларусаў. Вясёлага, аптымістычнага чалавека, веруючага ў жыццё, прасветлага. Адышоў ва ўзросце 79 гадоў.

Нарадзіўся ён у 1924 годзе ў Свіслачы, сярэднюю школу кончыў у Львове. У час акупацыі быў жаўнерам V Дывізіі Арміі Краёвай. Арыштаваны ў 1945 г. НКВД, быў сасланы ў гулаг. Пад Калымой вытрымаў 10 гадоў.

Заўсёды меў пад рукой нейкі афарызм, фрашку, каб развеяць чыйсьці кепскі настрой і страх. Славутыя былі яго фрашкі „Polityka Zbigniewa Waydyka", у якіх не шкадаваў ні правага, ні левага бакоў палітычнай сцэны, польскіх і іншаземных фобій, сцябаў паганыя рысы грамадства. Не было ў пану Збышку злосці і з'едлівасці. Заўсёды быў гатовы падзяліцца з чалавекам сваёй радасцю, распытаць пра яго клопаты, знайсці выхад, заўсёды з гумарам. Дзякуючы яму можна было больш аптымістычна глянуць на жыццё — па прыкладзе чалавека, які бачыў не адно, а захаваў сонечны погляд на жыццё. І проста не было як захаваць пры ім свой сум. „Nie łam się. Bywało gorzej!" — казаў часта.

Ніколі не прапускаў літаратурных сустрэч у Ваяводскай бібліятэцы. На аўтарскай сустрэчы з Артурам Шчэнсным, на якую прывялі таго ў гіпсе пасля цяжкага пералому нагі, усе азірнуліся — няма заўсёднага пана Збышка. Ён умеў бы падняць настрой паламанаму паэту! Ён развеяў бы сум, суцешыў... А ніхто з сабраных і не ведаў, што пан Збышак ляжыць цяпер у самоце ды ўрачыста маўклівы ў іншым казённым доме. А мы тут усе. А пасля, заўтра, на гарадскім могільніку... Шмат сяброў і прыхільнікаў не магло развітацца з гэтым добрым і разумным чалавекам. Гэта народныя, вясковыя паэты, рассеяны па мясцовасцях Падляшша, якія збіраліся з ім на паэтычных сенакосах, дажынках, растопах, замаразках...

Міра ЛУКША

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Добры выхад

Купляе бацька з вучнем-сынам
Камп'ютэр слаўны ў магазіне.
— Камп'ютэр, — прадаўцы
глумяцца, —
Зробіць за вас палову працы.

— Тады мы возьмем, — бацька
кажа, —
Камп'ютэраў тых два адразу.
І вось тады — і мы, і вы —
Будзем мець працу з галавы.

Кангур

Настаўнік пытае:
— Скажы мне, Артур,
Як выглядае
Аўстралійскі кангур?

— На бруху ён мае
Кішэню заўжды,
Туды ўцякае
У часе бяды.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Класы II і III з выхавацелькай Лідзіяй Панькоўскай. У ролі Дзеда Мароза солтыс Арэшкава Мікалай Жменька

У Арэшкаве віталі Маленькага Караля

21 студзеня г.г. у Пачатковай школе ў Арэшкаве адбылася навагодняя ёлка. Вучні прадставілі традыцыйныя калядныя абрады, дэкламавалі, спявалі калядкі і песні, абменьваліся віншаваннямі, сустрэлі Дзеда Мароза, а пасля гулялі на дыскатэцы. Было святочна і радасна.

Да святочнага мерапрыемства вучні і настаўнікі паставіліся вельмі сур'ёзна. Урачыстасць, якая адбывалася ў гімнастычнай зале, пачалася ў 10 гадзін раніцы. Дырэктар школы Гражына Бэрэзняк сардэчна прывітала ўсіх прысутных, у тым ліку і бацькоў, і пажадала вясёлай і прыемнай гульні. Далей мерапрыемства павяла вучаніца VI класа Паўліна Чурак.

Першымі выступілі на сцэне вучні з нулявога і першага класаў пад кіраўніцтвам сваёй настаўніцы Бэаты Маркевіч; іхняе выступленне прысутныя ўзнагародзілі гучнымі апладысментамі. Яны, са свечкамі і зялёнымі галінкамі ў руках, спявалі калядкі „Гэн высоко", „А ў Віфлееме".

Вядучая Паўліна Чурак паведаміла публіку, што ў народнай традыцыі, звязанай з каляднай васьмінай — ад Куцці да Вадохрышча, — прысутнічае батлейка. Вучні другога і трэцяга класаў пад кіраўніцтвам Лідзіі Панькоўскай паставілі спектакль „Наша батлейка" — пра нараджэнне і падзеі з ранняга дзяцінства Ісуса. У ролях Ірада і Чорта выдатна праявілі сябе Марцін Мішчук з пятага і Лукаш Андрасюк з шостага класаў. Для гэтай пастаноўкі вучні старанна нарыхтавалі патрэбныя ўборы і рэквізіты; дзеля гэтага з арэшкаўскай царквы пазычылі нават кадзіла. Захапленне публікі выклікала арыгінальная вялікая карціна стайні, намаляваная Лідзіяй Панькоўскай. Як згадвае Біблія, *калі Ісус нарадзіўся ў сціплай стайні, бо ў гасцініцы не было месца, Анёл паведаміў непадалёкім пастырам радасную навіну. Пастыры прынеслі Дзіцятку дары; было гэта першае зямное пакланенне нованароджанаму Хрысту. У Віфлееме, куды з горнай пячоры перасялілася Святая Сям'я, Ісусу пакланіліся тры мудрацы-каралі, прыносячы дары: золата, кадзіла і міру. Анёл асцярог іх, каб не вярталіся да Ірада, бо жорсткі кароль хоча забіць Ісуса.* Батлеечны спектакль склалі пяць евангельскіх эпізодаў. У час прадстаўлення маладыя акцёры спявалі калядкі „Сёння ў Віфлееме", „Bóg się rodzi", „Wśród nocnej ciszy", „Pójdźmy wszyscy do stajenki", „Lulajże Jezuniu". Пастаноўку нечакана суправаджаў плач маленькага дзіцяткі з публікі.

Вучні старэйшых класаў дэкламавалі вершы ды спявалі калядкі; песні выконваліся на трох мовах: польскай, рускай і беларускай. Вучні IV-VI класаў прадставілі інсцэніроўку шчодрага вечара. Кася Дунда і Паўліна Чурак з VI класа праспявалі песню „Першая любоў", а потым, разам з Марцінам Мішчуком, праспявалі публіцы святочныя пажаданні.

Пасля мастацкай часткі вучні пабедалі і чакалі прыходу Дзеда Мароза, у якога ўвасобіўся солтыс Арэшкава Мікалай Жменька. Пасля падарункаў было гулянне са шматлікімі віктарынамі.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Злева: Альжбета Антанюк, Крыстыян Дунда, Арак Галёнка, Марыюш Харашэўскі і Беата Аксютыч

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Кастусь Каліноўскі

„Мужыцкая праўда"

Улетку 1862 года ў беларускіх вёсках і мястэчках пачалі знаходзіць невялікія друкаваныя лісткі. Іх можна было разгладзіць на каленях у хвіліны адпачынку проста на полі, а пачытаўшы — лёгка схаваць.

Гэта была першая ў гісторыі беларуская газета — „Мужыцкая праўда".

Прачытаўшы яе назву, пісьменны селянін вадзіў пальцам па радках і здзіўлена адкрываў для сябе, што газета на простай і зразумелай мове сапраўды гаворыць пра мужыцкія клопаты.

„Мужыцкую праўду" выдаваў Кастусь Каліноўскі і яго паплечнікі Фелікс Ражанскі, Станіслаў Сангін і Валер Урублеўскі. Пад кожным нумарам газеты стаяў подпіс — „Яська-гаспадар з-пад Вільні". Гэтым таямнічым Яськам быў Каліноўскі. Ён сам рыхтаваў для газеты артыкулы, сам развозіў яе потым па вёсках, раскідваў на дарогах.

„Мужыцкая праўда" тлумачыла беларусам, як царская ўлада іх падманвае і прыгнятае, як адбірае ў іх не толькі цяжка зароблены грошы, але і родную мову ды бацькоўскую веру.

У першым нумары Яська-гаспадар пісаў: „Дзецюкі! Цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаць такую праўду справядлівую, як Бог на небе. Загрыміць нашая праўда і, як маланка, праляціць па свеце! Няхай спазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, але яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўдзе..."

Усяго выйшла сем нумароў газеты. Апошні пабачыў свет ужо тады, калі на беларускай зямлі грымела паўстанне. Каліноўскі заклікаў сялянаў браць у рукі косы ды вілы і далучацца да тых, хто ўжо б'ецца за вольнасць.

(працяг будзе)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

За супольным сталом: (справа) а. Іаан Раманчук, а. Марк Якімюк, настаўніцы Марыёля Падсядлік, Альжбета Ціханюк, Валянціна Андрасюк і вучні

Куцця ў Чыжоўскай школе

У Падставовай школе ў Чыжах 2 студзеня 2003 года была арганізавана Куцця. Дзеці I-III класаў сустрэліся ў класных кабінетах, а вучні IV-VI класаў і іх выхавацелькі — Марыёля Падсядлік, Валянціна Андрасюк і Альжбета Ціханюк — арганізавалі Куццю ў актавай зале.

Удзельнічалі ў мерапрыемстве дырэктар школы Міраслаў Пяткевіч і святары Іаан Раманчук і Марк Якімюк. Спачатку айцец Іаан Раманчук прачытаў фрагменты Бібліі і расказаў аб нараджэнні Хрыста ў традыцыі іншых веравызнанняў. На вячэру вучні і бацькі падрыхтавалі куццю, рыбныя стравы, пірог з макам і шчолак з груш. Найсмачнейшымі былі селядцы, якія падрыхтавала сяброўка Кася. Залу ўпрыгожылі вучні VI класа з настаўніцамі. У час каляднай вячэры сабраныя спявалі калядкі „Неба і зямля", „Учора з вячора" і іншыя на беларускай, польскай і рускай мовах. Святы Мікалай кожнага вучня абдорыў сшыткамі і ласункамі. Куцця ўвяла сабраных у святочны настрой. Думаю, што такія калядныя вечары садзейнічаюць захаванню традыцый, якія ўжо занікаюць у нашым рэгіёне.

Эмілія Місяюк

Дзённік Міколы

Вы мне прысніліся

„Гары Потэр" і тэатр у спадарыні Клемянціны моцна замуціў нам рэальнае адчуванне свету і часу. Мы не хацелі вяртацца дахаты. Праўда, пачыналіся зімовыя канікулы і бацькі дазволілі нам больш часу адвесці на сяброўскія сустрэчы і гульню. Мы былі ўжо застарыя, каб ляпіць снежную бабу або гуляць у снежкі.

— Давайце завітаем да Нор Узі, — прапанаваў я. Нашы новыя сябры захапіліся прапановай. Мы ўжо паспелі тое-сёе сказаць пра мастака.

— Як добра, што вы тут! — прывітаў нас Нор Узі. Ён з цікавасцю зірнуў на Максіма, Марту, Мілаша і Міхася.

— Я пакажу вам сваю новую карціну, — завярнуўся на пяце мастак. Ён пайшоў у левы „кут" сваёй паўкруглай залы і пачаў перабіраць свае творы.

— Ёсць! — усклікнуў тонам пераможцы. — Ёсць!

Праз момант мы пабачылі яго новую карціну і, сапраўды, страцілі кантакт са светам. Як ачмурэлыя, глядзелі на мастака і чакалі нейкага паяснення.

— Ну, досыць! — прызваў нас у парадак жывапісец. — Прачніцеся!

— Вой, — піснула Марта. — Якім чынам вы гэта зрабілі?

Мастак заўсміхаўся і сказаў:

— Мае дарагія, калі мы пабывалі ў Краіне Гот, памятаеце, я здрамнуўся.

— Памятаем, — адказалі мы хорам.

— А пасля, я быў узбуджаны і ўсклікнуў — „ёсць"! Памятаеце?

— Памятаем.

— І сказаў... „Рыжыкі". Памятаеце?

— Сапраўды, так было.

— Я тады пабачыў у сне нашых новых сяброў.

— Як гэта вы пабачылі? — не верыла Марта.

— Нармальна, вы мне прысніліся.

— І наш коцік таксама, — пажартаваў Міхась.

— Не, ката не было. Я сам яго прыдумаў.

Пасля гэтага мы доўга не маглі апрытомнець і стаялі як зачараваныя.

— А як там ваш школьны конкурс мастацтва? — пацікавіўся Нор Узі.

— Што?

— Ваш конкурс.

— А... — мы падумалі, што сапраўды трэба рыхтавацца да конкурсу.

Усе мы змоўклі. Кожны з нас думаў пра сваё. Карціна Нор Узі толькі папоўніла змест усяго дня. З надзеяй разышліся па хатах.

Уначы я думаў пра мастацкі конкурс. Думка была ўжо ў галаве, але яшчэ было зарана, каб вымавіць трыумфальнае слова — „ёсць"!

(працяг будзе)

(нак-с)

Польска-беларуская крыжаванка № 7

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 3: Пірог, кок, траса, грыб, шар, рыс, куст, кубак, ядак, мята. Пах, груд, грыб, рысак, граб, кашуля, Ас, картка.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Лукаш Габрылеўскі**, **Іаанна Раманюк**, **Марцін Александрук**, **Івона Трафімюк**, **Паўліна Мароз**, **Ева Янцэвіч**, **Наталля Герасімюк** і **Караліна Рабак** з Новага Корніна, **Раман Лушчынскі** з Бельска-Падляшскага, **Паўля Вітальеў** з Орлі. Віншуем!



Падсталовая школа

Шурык хадзіў ужо ў школу. Хоць, па росце, не выглядаў на вучня першага класа. Пайшоў у школу ў шэсць гадоў, да таго быў маленькі ды шчупленькі — мала большы ад мяне, маладзейшай. Шустры Шурык — называлі яго бацькі ды суседзі. Надакучаў ён усім — не ўседзеў ні хвіліны на адным месцы, чапляўся да суседскіх хлопчыкаў, нават большых за яго. Дзіўным чынам не дакучаў якраз мне, чатырохгадовай худзенькай малечы. Знаходзіў час для мяне — найчасцей садавіліся мы за будынкам сіласа, каля слівак, якія сыпаліся нам на галовы, на кучы жоўтага чыстага пяску. Стаяў там і высокі стары прастакутны стол, які выкінуў з хаты мой дзедка. У стале было многа круглях дзірачак і штосьці час ад часу цыркала ды пукала ўсярэдзіне; дзедка казаў, што ў стале жывуць шведы... Калі пакрапваў дождж, можна было засесці пад гэтым населеным шведамі сталом.

Я найбольш зайздросціла Шурыку аднаго: меў лемантар і сшыткі, хадзіў у школу.

— Якая тая школа?

— Ну, называецца яна... тая... падсталовая, — паглядзеў Шурык на наш стол, пад якім мы заселі з кошычкам поўным чорных слівак, і выплюнуў костачку. — Ат, такое там!.. Сядзець трэба ціха... Ну, адурэць можна. І ўсё пытае ў нас вучыцелька, бы сама не ведала нічога.

— То ж у школу ходзяць каб ведаць! — здзівілася я. — Кажаш, падсталовая?..

І хоць я ўжо бачыла, едучы на фуры з дзедкам ад цягніка, новы, вялікі, цагляны будынак школы ў Семяноўцы, што каля царквы і аграмадных шумлівых дрэў, на якіх крычаць галкі: „Птак-птак!", уявілася мне, што мы з Шурыкам сядзім у сваёй школе — пад нашым сталом.

— Пакажы мне лемантар. Я пісаць хачу.

— Пойдзеш, навучышся. Няма чаго спяшацца! — цяжка ўздыхнуў Шурык. — Я потым пакажу табе літару О, нарысую палкай на сцежцы... Лепш пакажы свайго Мурынка...

Малы пластмасавы карычневы негр, мая адзіная крамная лялька, вытыркаўся з пяску. Шурык учора пераканаў мяне, што ён захварэў і памёр, і мы яго ўрачыста пахавалі.

— Ужо здаровы? Давай, пабачым, што там у яго ў сярэдзіне — мабыць, на жывот захварэў, — Шурык ухапіў ляльку за пульхную ножку.

— Не руш! Яму баліць! — я залілася слязамі.

— Трэба было плакаць учора, як мы яго хавалі.

— Мы ж яго пахавалі толькі на адзін дзень...

Шурык калупнуў жалезінкай Мурыну збоку жывата, дзе было відаць шнар — тут яго склейвалі на фабрыцы. І распалася папалам мая лалька.

— А ён жа пусты ў сярэдзіне! Я так і думаў! — махнуў рукою Шурык і выйшаў з-пад нашай падсталовай школы.

Пасля Шурык з'ехаў з мамай у Францыю. Сустрэліся мы праз пятнаццаць гадоў. І не пагаварылі як след. Забыўся ён нават нашу мову, не то што хвіліны пад нашым сталом.

Міра Лукша

Юзаф Харытон, Галава яўрэя (рысунак тушшу)

Матэйка і яўрэйскае мастацтва ў Ратушы

У Падляшскім музеі можам пабачыць выставу Яна Матэйкі. Не як вялікага мастака, а як калекцыянера прыкладнога мастацтва. Калекцыя (невялікая частка збораў) прыехала з Нацыянальнага музея ў Кракаве. Гэта рэчы, якія „статыставалі" ў гістарычных карцінах Яна Матэйкі. Мастак купляў экспанаты, заказваў у майстэрнях па старажытных узорах, прывозіў з падарожжаў — адзенне (сукні, шалікі, пальчаткі, саквы...), біжутэрыю, боты, дробныя дэталі. Некаторыя з прадметаў маюць пару сотняў гадоў, іншыя былі толькі ў абсталяванні майстэрні мастака, але ўсе яны ствараюць незвычайную выставу старажытнасцей. Ёсць на выставе, напрыклад, кардынальскія рукавіцы з XVII стагоддзя („выступілі" яны ў „Грунвальдскай бітве" і ў „Прысязе Прусіі на вернасць Польшчы"). Пшэворскія паясы парусотгадовай даўнасці, паштарскія боты (XIX ст.), сукманы („Касцюшка пад Рацлавіцамі"), дарагія гузікі-запоны, 400-гадовыя малітоўнікі, карункі, колія крытая золатам (уласнасць жонкі Яна, Тэадоры)... Усе іхныя дэталі мастак капіраваў, разрысоўваў дэталі (на выставе ёсць частка эскізаў), капіраваў пячаткі, старыя рысункі. Ёсць і фрагменты эскізаў паліхроміі з Марыяцкага касцёла і з цыкла, які Матэйка выконваў для Львоўскай політэхнікі „Гісторыя цывілізацыі ў Польшчы"... Выставу можна глядзець ад студзеня да сакавіка.

На іншай выставе ў Ратушы „Час заклікаць" можна пазнаёміцца з малюнкамі і рысункамі Юзафа Харытона, якія прадстаўляюць сцэны з жыцця і партрэты яўрэяў. Быў ён сведкам расстрэлаў цэлых яўрэйскіх сем'яў, рабіў нават тайком здымкі гэтых страшных падзей. Ва ўспамінах пра Харытона чытаем: „Вярталіся да яго памерлыя, вядомыя яму раней людзі, прасілі іх увекавечыць". Вызваліў іх у сваёй памяці, выпаўніў „просьбы памерлых". Шмат прац Харытон параздаваў, частку прадаў за капейкі, многа з іх загінула. Частка карцін Харытона — уласнасць Падляшскага музея, іншая — пазычана з калекцыі Яўрэйскага гістарычнага інстытута. Партрэты і сцэнкі — быццам улоўленыя аўтарам у жывы момант, а не выкліканыя з памяці. Харытон быў не толькі мастаком, а і паэтам, вынаходцам, містыкам, цікавіўся рэлігіямі, кабалістыкай. Шмат гадоў стараўся збудаваць магнітны генератар, які дзейнічаў бы на аснове магнітных палёў.

У Ратушы можна набыць кнігу Ізабелы Рэйдух-Самкавай і Яна Самка „Даўняе яўрэйскае мастацтва ў Польшчы" (100 зл.). Гэта вельмі прыгожы (шмат здымкаў і рэпрадукцый, харошае графічнае афармленне) і цікавы, багаты па змесце альбом. Знойдзем там нарысы пра гісторыю яўрэяў у Польшчы, развіццё мастацтва і самыя цікавыя мастацкія старажытнасці пачынаючы ад сярэднявечча. У Варшаве ўзнікае Музей гісторыі польскіх яўрэяў. Будуць там збірацца не толькі сведчанні культуры, але і эканомікі, грамадскай і палітычнай гісторыі гэтага народа, які стагоддзі жыў разам з іншымі народамі ў нашай краіне. Што цікава, у музеі ўваходзіць таксама і мультымедыйная тэхніка, якая дапаўняе традыцыйны паказ.

(лук)

Узнагарода імя Веслава Казанэцкага

„Тутэйшыя" Плютовіч і Рэдлінскі

Ежы Плютовіч і Эдвард Рэдлінскі атрымалі ўзнагароду прэзідэнта Беластока імя В. Казанэцкага за 2002 год. Уручаецца яна ў дзень смерці (2 лютага) гэтага вядомага беластоцкага паэта выбранаму капітулам узнагароды аўтару найлепшай беластоцкай кнігі. У гэты раз лаўрэтаў было двух, і — абодва добрыя знаёмыя, да таго блізкія сябры Казанэцкага, і ўзнагароду (4 000 злотых) падзялілі папалам. Сума ўзнагароды, як на польскія меркі, маленькая — гэта, здаецца, мо і менш, чым управа горада выдала на мілы банкет на заканэчнне *фэты*. Але факт фактам — узнагарода ёсць, на культуру места грошай крыху мае, сабраўся ўвесь цвет беластоцкай культуры (у тым крышку мінулагодніх лаўрэатаў) і амаль усе чыноўнікі з магістрата.

Узнагароджана была кніга (выдадзеная... на Келеччыне сябрам-выдаўцом Плютовіча) „Zapomniana wojna. Europa po deszczu" і „Transformejszen" аўтара „Канапелькі", які сваю тутэйшасць загубіў недзе па Амерыках, жыве ў Варшаве, у Беластоку бывае зрэдчас, але, усё ж, ён „наш", да таго вельмі вядомы. Ягоная новая кніга ў самой Польшчы не апынулася ў саставе найлепшых. Сам аўтар, здаецца, патрактаваў прыезд у Беласток як нагоду зрабіць сабе фестываль, у адрозненне ад заўсёды сціплага, у вечным одуме, невялікага вялікага паэта Плютовіча, які адным сказам скажа найважнейшае. — Паэты маюць дар кароткага маўлення, а я, як празаік, буду гаварыць больш, — пачаў празаік. І хоць сталы ўгіналіся ад страў тутэйшых ды смакавітых, аўтары пабеглі выступаць яшчэ ў „Падляшскую ксёнжніцу". А раней была і кнігарня „Акцэнт", дзе падпісваў сваю кнігу Рэдлінскі; гэтая кнігарня ідзе, здаецца, наперадзе іншых кніжных крамаў у сваёй ініцыятыўнасці.

Пасля „Трансфармэйшн, або — як галёнка танцавала з гамбургерам", кажуць, жыхар Польшчы павінен адчуць катарсіс і зразумець свае фобіі ды комплексы. Канкуруюць, вось, сець бараў МакДональдса з барам „Бігос ды галёнка". Вось, спадар Юрас думае стварыць сець бараў са старапольскім *едлам*, а ставіць іх каля касцёлаў (якіх у Польшчы — 10 тысяч, значыць, і такіх сталовак было б столькі ж). Рэдлінскі жартуе сабе са святасцей?.. Белых, чырвоных, паласатых... З'едліва паўтараў на ўручэнні: „Я як пісаж бардзо правіцовы..." Кажа, ад гэтай кнігі свет не перакуліцца. На вокладцы — на шары пузаты твар таўстуна з вываленым языком у белачырвоную палоску. Проста, сатырычны рэпартаж. Урэшце, Рэдлінскі — быў журналістам, і кульнулі яго ў свой час разам з нашым Сакратам.

Міра Лукша

Плён VII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Іаана Масайла

Забыванне

Забываю, забываю
Ды забыць не магу.
Плачу, думаю, гукаю
Праз гадоў ліхіх смугу.

Кружыць вір ваду рачную,
Ад цябе я не таю,
Як насіць мне мысль такую,
Што цябе я не люблю.

Не забуду я ніколі
І паверу варажбе,
Што не будзе шчаснай долі
Мне з табой і без цябе...

Славамір Кулік

* * *

Хопіць кахаць,
Каб на крылах ляцець у родную хату.
Хопіць любіць,
Каб шанаваць сваё роднае.
Хопіць хацець,
Каб радзіма была шчаслівай краінай.
Малюся за цябе,
Мой родны кут,
Мая любімая Беласточчына.

Мікалай Лук'янюк

Айчына

Беларусам я радзіўся,
Беларусам мяне зваць.
Сваю родную айчыну
Шчыра буду шанаваць.

Ад вякоў тут пражывае
Беларускі наш народ,
Ганарыцца гэтым краем,
Што ляжыць сярод балот.

Мне пяскі тут дарагія,
Дзе радзіўся й пражываў,
Шум ціхонькае рачулкі,
Што ў маленстве калыхаў.

Я ніколі не забуду
Пра свой родненькі куток,
Шанаваць яго я буду
Да апошніх сваіх дзён.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Марыя Бабулевіч з удзельнікамі мастацкага гуртка

Пяць гадоў з мастацтвам

Мастацкі гурток „Каларыт" з Бельскага дома культуры ў 2002 годзе адсвяткаваў пяцігоддзе свайго існавання. Яго ўдзельнікі і іх апякун Марыя Бабулевіч падрыхтавалі выстаўкі сваіх прац, створаных на працягу пяці гадоў.

Гурток заснаваны быў у 1997 годзе як ткацкі і спачатку належала да яго каля дзесяці дзяўчат ва ўзросце 9 і 10 гадоў. Вучаніцы праектавалі свае працы і вучыліся ткаць, а пасля зацікавіліся габеленам. Пазней вучні пачалі рысаваць і маляваць. На заняткі прыходзілі школьнікі ва ўзросце ад 5 да 18 гадоў і ўзніклі тады 3 узроставыя групы. Дадаткова вучні займаліся лінарытам і калажам. Моладзь прымала ўдзел у ваяводскіх, агульнапольскіх і міжнародных мастацкіх конкурсах. Вучні атрымалі ўзнагароды на біенале дзіцячага мастацтва ў Элку, біенале творчага мастацтва ў Вроцлаве, Міжнародным біенале графікі ў Торуні, у конкурсе помнікаў царкоўнага мастацтва ў Варшаве і многіх іншых. Працы маладых мастакоў паказваліся на выстаўках у Бельскім доме культуры і бельскіх школах. У час канікулаў арганізаваны былі мастацкія курсы ў БДК, вучні выязджалі ў пленэр, каб маляваць там краявіды. З прац маладых бельскіх мастакоў была арганізавана выстаўка мастацтва ў Музеі Дарафея Фіёніка ў Студзіводах. Апрача малявання вучні займаліся разьбой і графікай. Апошнім часам аднавіў сваю дзейнасць ткацкі гурток.

Аляксей Мароз

Акультызм — д'ябальская штучка

У народзе прынялося, што людзі свята вераць у нейкія прыметы, забабоны, шаптунства, чарадзейства, талісманы. Калі нехта пяройдзе перад кім з пустым вядром вуліцу, дык гэта дрэнны знак, пасля якога трэба сцерагчыся. Я, калі мне трэба перайсці вуліцу з пустым вядром, ніколі гэтага не раблю перад іншай асобай, бо так некультурна. Кажуць, што як і чорны кот перабяжыць вуліцу перад некім, дык таксама трэба чакаць дрэннага. А калі спускаецца павук, тады трэба чакаць нейкай весткі. Гэтыя прыметы мо і смешныя, але ў іх нельга верыць, бо ўсё гэта дурніцы, дзе Бога нічуць няма, а толькі ад цёмных сіл яны выводзяцца. Але хто вельмі верыць у такія прыметы і забабоны, тады яны могуць праявіць сваю сілу і пустое вядро ці чорны кот могуць прынесці нейкі клопат ці сварку. Гэтых прымет мноства і месца ім у яме нашага забыцця.

На скрыжаваннях дарог часта можна ўбачыць пакінутыя хустачкі ці кашулі; відаць нейкія чараўнікі хочуць свае клопаты перадаць іншым — тым, хто гэта падыме, хаця сёння мала такіх наіўных, якія не ведалі б, што гэта абазначае.

Леткам мінулага года адзеў я новы паштовы касцюм і ў адной цёткі (а яна не ўхіляецца ад забабонаў) плаціў грошы. Яна стала нейкім дзіўным тонам хваліць той касцюм. І ў Грабаўцы, на крутым павароце вуліц, у той самы дзень я ўпаў з мотаровара і новыя нагавіцы парваў і моцна пакалечыў калена; так, відаць, тая цётка мне пажадала. Але Бог з ёю, не адны ў мяне нагавіцы.

Часта можна пабачыць, як нейкі дзядзька вядзе за вуздэчку сваю жаробную кабылу і на скрыжаванні вуліцы і шашы мо з дзесяць разоў водзіць яе навокал, нягледзячы, што там вялікі дарожны рух. І дзіўна: кабыла тая паводзіць сябе вельмі спакойна і не баіцца аўтамашын.

Чуў я, што зараз пасля вайны аднаго хлопчыка ахапіла атака эпілепсіі. Але ягоная маці не разгубілася, толькі адразу задзерла брудную спадніцу і голай сракай стала вадзіць па твары хворага; і так „вылечыла".

Бывае, што каровы, свінні ці парасяты ад прадаўца не ўдаюцца: карова перастае даваць малако, а парасяты ці свінні хварэюць а то і дохнуць. Тады ў народзе кажуць, што прадавец меў цяжкую руку і не жадаў пакупніку, каб у яго развялося, але каб звялося. Значыць, той чалавек чараўнік і звязаны з д'яблам, хаця мо і рэгулярна ходзіць у царкву. Найлепш з такімі людзьмі не мець нічога супольнага, і калі ад такога давядзецца нешта няўдачліва купіць, дык трэба маліцца Богу, каб выгнаў з яго дэманскія сілы, бо жывёла невіноўная, толькі вядзьмар.

І яшчэ некалькі слоў пра шаптух і шаптуноў, хаця яны ў сваіх д'ябальскіх дзеяннях часта карыстаюцца Бібліяй. Не верце ім, бо і д'ябал навыдатна знае святую кнігу і нават можа разгадаць яе прароцтвы; людзі, а асабліва хрысціяне, павінны аб гэтым ведаць. А з таго, што нейкая Ганна з Руткі ці Валечка з Орлі некаму „памаглі", нельга цешыцца, бо бяда, калі сам д'ябал чалавека падлечыў з тою мэтай, каб пайшоў ён у вечнае пекла.

Ёсць хрысціяне, як баптысты, пяцідзесятнікі, адвентысты ці нават ієгавісты, якія не вераць у цёмныя д'ябальскія сілы, толькі вераць у жывога Бога і Біблію. *Не рабі сабе куміра і не стварай ніякага вобраза таго, што на небе ўверсе, што на зямлі ўнізе і што ў вадзе ніжэй зямлі — не пакланяйся ім і не служы ім, бо Я Бог твой, апякун, караючы дзяцей за правіны ненавідзячых Мяне бацькоў іх да трэцяга і чацвёртага пакаленняў і творачы міласэрнасць тысячам пакаленняў любячых Мяне і выконваючых Мае запаветы.* (Выхад 20, 4-6).

Мікалай Панфілюк

Кантычка 2003

Чатыры дні ў Бельску-Падляшскім працягваўся Агульнапольскі дзіцяча-маладзёжны фестываль сучасных калядных песень і пастараляў. Ужо чацвёрты раз Бельскі дом культуры сарганізаваў спатканне маладых выканаўцаў з усёй Польшчы. У Бельск завітала каля 50 асоб ва ўзросце ад 4 да 24 гадоў, якія прынялі ўдзел у конкурснай частцы. Найбольш удзельнікаў было з Падляшша. Прыехалі таксама выканаўцы з Новага Сонча, Закапанага, Белай-Падляшскай, Чанстаховы. Маладыя салісты ўжо ў чацвер 30 студзеня пачалі музычныя заняткі пад вопытным вокам Бэаты Бэднаж, Пятра Назарука, Мар'юша Пэркоўскага і Юстыны Пажазінскай.

У катэгорыі 7-11 гадоў, у якой выступіла 17 асоб, вылучэнне атрымалі Паўліна Вэрэль з Беластока і Эліза Шылоў з Сувалкаў. Анджэліка Куліга і Юстына Залеўская занялі супольна трэцяе месца, атрымоўваючы „Бронзавую флейту". „Сярэбраную флейту" журы прызнала Эміліі Шульц з Бельска-Падляшскага, а „Залатую флейту" і галоўную ўзнагароду — Вялікага мядзведзя (цацку) атрымала Караліна Пажазінская — таксама з Бельска.

Сярод 17 удзельнікаў у групе 12-15 гадоў узнагароды заваявалі: „Сярэбраную флейту" Адам Лечыцкі з Біскупца, а „Залатую флейту" — Амэлія Горбач з Гайнаўкі за песню „Зноў святы". Вылучэнні атрымалі Сільвія Тарасюк і Караль Врублеўскі.

Больш прафесійнымі аказаліся ўдзельнікі трэцяй узроставай групы — 16-20 гадоў. Трэцяе месца заняў бяльшчанін Пётр Шайкоўскі, другое — Ніка Любовіч з Закапанага, а першае месца Моніка Дымэк з Белай-Падляшскай. „Залатую флейту" сярод найстарэйшых удзельнікаў ад (21 гадоў) атрымала Юстына Маленчук таксама з Белай-Падляшскай — горада, які ў гэтым годзе прыслаў на фестываль самых найлепшых — бо і найлепшай кампазіцыяй „Кантычкі 2003" аказалася песня „Бяжы да Пана" Кшыштафа Алесеюка, жыхара Белай-Падляшскай.

Вялікае ўражанне ў публікі, якая тлумна прыбыла ў Бельскі дом культуры ў нядзельны вечар 2 лютага, зрабіла выступленне наймалодшых удзельнікаў — Ады Маліноўскай з Беластока, якая выступіла ў народным падляшскім уборы і Корнеля Гладыся з Чанстаховы. Хлопчык, атрымаўшы ўзнагароду ад спонсара Артура Жукоўскага, голасна закрычаў у мікрафон: „Не аддам, маё!", калі яму было цяжка паднесці ўзнагароду.

Вечар закончыўся канцэртам Бэаты Бэднаж. Разрадаваныя ўдзельнікі фестывалю яшчэ доўга ўспаміналі і будуць успамінаць спатканне з калядкамі і пастаралямі.

Паўліна Шафран

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Прадстаўленне з каляднымі элементамі паказаў калектыў з Замбрава

Разнароднасць калядавання

XXII Ваяводскія сустрэчы калядных калектываў, якія 26 студзеня адбыліся ў Гайнаўскім доме культуры, адрозніваліся ад павятовага каляднага агляду разнароднасцю калектываў. Побач праваслаўных каляднікаў з гвяздай выступілі калектывы з каляднымі прадстаўленнямі: з шопкай, казой, гэродамі, папулярнымі сярод каталіцкага насельніцтва.

Мерапрыемства адкрылі дырэктар ГДК Андрэй Скепка і віцэ-дырэктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры Барбара Пахольская. Зачытала яна адкрыты ліст працаўнікоў ВААК у Беластоку да Міколы Бушко, былога дырэктара ГДК з падзякай за амаль 24-гадовую працу ў ГДК і арганізацыю Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі ды пажаданнямі далейшай плённай працы ў галіне культуры.

Першымі выступілі вучні з калектыву „Рамонка" з Ласінкі, якія заспявалі калядкі на тры галасы.

— „Рамонка" калядавала цудоўна, а іх спеў быў чысты і далікатны, — заявіла Барбара Пахольская.

Вучні з Ласінкі, якімі цяпер апякуецца Марыя Радчук, з'яўляюцца пераможцамі на фестывалях царкоўнай музыкі ў Мінску і Магілёве. Занялі яны першае месца ў Аглядзе калядных калектываў у Тарэспалі. У ГДК спявалі па-царкоўнаму, апранутыя ў белыя блузкі. Камісія звяртала ўвагу на згоднасць спеву з вясковай традыцыяй і таму каляднікі з „Рамонкі" не атрымалі ўзнагароды.

— Нават у царкве вясковыя харысты спявалі апранутыя ў цёплую вопратку, бо ў мінулым цэрквы не ацяпляліся, — сказаў член камісіі Сцяпан Копа.

Затое камісіі спадабалася выступленне жанчын з Арэшкава, якія занялі першае месца ў катэгорыі дарослых каляднікаў. Калядавалі яны з гвяздай на два і тры галасы, апранутыя па-зімоваму. Важным элементам у іх выступленні былі красамоўныя прывітанні і пажаданні, характэрныя каляднікам Гайнаўшчыны.

— „Арэшкі" спявалі моцнымі, сакавітымі і непаўторнымі галасамі, якія гарманічна зліваліся ў адну цэласць, — гаварыў Сцяпан Копа. — Няма другога такога калектыву на Беласточчыне, які б так цудоўна спяваў. Песні з іх рэпертуару непаўторныя.

Раўнапраўнае першае месца заняў рэгіянальны калектыў „Ліпск" з Ліпска, які паказаў каляднае прадстаўленне. Другое месца занялі „Асенні ліст" з Гарадка, „Чарнавяцы" з Чорнай-Всі-Касцельнай і „Нарвянкі" з Крушэва. Калектыў „Асенні ліст" паказаў традыцыйнае праваслаўнае калядаванне з гвяздай, прашэннямі, пажаданнямі (у якасці рэквізіту на сцэне быў кошык з хлебам, каўбасою і гарэлкаю, якімі ў мінулым узнагароджвалі каляднікаў). „Чарнавяцы" прадставілі калядаванне з шопкай і пажаданні на польскай мове. У Чорнай-Всі-Касцельнай выконваліся керамічныя вырабы і таму персанажы шопкі (Хрыстос, каляднікі і звярына) былі керамічнымі. Калектыў „Нарвянкі" з Крушэва прэзентаваў калядаванне з казой (сустрэча гаспадароў з казой прадвяшчала добры ўраджай на ўвесь год і таму сяляне ахвотна прымалі каляднікаў). Трэція месцы атрымалі „Клепачанкі" з Клепач і „Рудзяне" з Вулькі-Ратавецкай. У катэгорыі дзіцячых і маладзёжных калектываў першыя месцы занялі „Прамычкі" з Чорнай-Беластоцкай і дзяўчаты з Тураслі, якія калядавалі на курпёўскай гаворцы. Другога месца камісія не прысвоіла, а трэцяе атрымалі хлопцы з Тураслі, якія таксама калядавалі па-курпёўску.

Жанчыны з Вулькі-Тэрахоўскай, хаця прыгожа спявалі і выступалі ў традыцыйнай вопратцы, не дабіліся перамогі. Не вылучыла камісія таксама хору Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, хаця гімназісты таксама спявалі прыгожа. У ліку кваліфікаваных на ваяводскія спатканні не апынуліся вучні з абодвух гайнаўскіх ліцэяў і Чаромхі.

Каляднікаў хвалявалі патрабаванні камісіі, якая прытрымоўвалася перш за ўсё згоднасці выступленняў з вясковай традыцыяй. Прыгажосць спеву і прэзентацыя на сцэне станавіліся менш важнымі.

Аляксей Мароз

Белавежа

Зачараванне пушчай

19 студзеня ў Белавежскім асяродку культуры адкрылі выстаўку карцін Славаміра Рыбака з Нурца-Станцыі, прысвечаную Белавежскай пушчы ў розныя поры года ды таксама прыпушчанскім мясцовасцям, а перш-наперш іх непаўторнай прыгажосці. Жывапісец малюе свае карціны алейнымі фарбамі. На выстаўку даў каля 30 палотнаў. Гэта яго ўжо дваццатая выстава карцін. Глядзець яе можна ў БАК да 19 лютага г.г.

(яц)

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Парк у цэнтры Орлі

Арлянская забудова

Старое мястэчка Орля, сядзіба гмінных улад, мае багатае гістарычнае мінулае. Пачаткі існавання Орлі сягаюць у старажытнасць, доказам чаго з'яўляюцца знойдзеныя тут вырабы з каменя і бронзы. Названне мясцовасці выводзіцца ад ракі і арлоў, якія калісь тут выводзіліся. Першыя весткі пра Орлю захаваліся з XVI ст. У 1622 годзе Радзівілы пабудавалі тут замак і кальвінскі збор. У 1634 годзе Орля атрымала гарадское права, якое страціла ў канцы XIX ст., калі арлянская маёмасць была прададзена жыхарам Орлі і наваколь-ных вёсак. Росквіт горада працягваўся да канца XIX ст. У 1897 годзе мястэчка налічвала каля 3 тысяч жыхароў, з чаго 80% складалі яўрэі. У 1938 годзе Орля пацярпела ад пажару; згарэла тады 540 будынкаў — 30% забудовы. Другая сусветная вайна прычыніла мястэчку далейшыя страты: падзенне ліку жыхароў і рэгрэс. На 1 студзеня 1945 года ў Арлянскай гміне пражывала 10 064 жыхароў; у наступныя гады лік жыхароў падаў: у 1970 годзе — 7 020, у 1991 — 5 018, у 1997 — 4 163, у 2000 — 3 837 і ў 2002 — 3 760 асоб. Як вынікае з дэмаграфічнага аналізу, лік жыхароў у гміне стабілізуецца і няма патрэбнасці вызначаць новыя месцы для жыллёвай і гаспадарчай забудовы.

Забудова ў Орлі патрабуе шмат увагі. Шэраг будынкаў і урбаністычная кампазіцыя падлягаюць кансерватарскай ахове. У гістарычным абшары мясцовасці павінны быць захаваны існуючыя вуліцы, традыцыйны маштаб забудовы і кшталт дахаў. У выпадку новых інвестыцый трэба карыстацца традыцыйнымі будаўнічымі матэрыяламі як гладкія тынкі, драўляная сталярка, бляшаныя або керамічныя дахі.

Аднаўлення патрабуе цэнтр Орлі з характэрным цэнтральным пляцом. Трэба аднавіць рынак і вярнуць яму гістарычна ўласцівую ролю цэнтра. Дзеля гэтага трэба апрацаваць архітэктурную канцэпцыю добраўпарадкавання рынку. Незабудаваныя дзялянкі з паўднёвага боку прызначыць пад паслугова-гандлёвую забудову з магчымай жыллёвай функцыяй, стварыць уласнікам магчымасць размяшчэння паслуговых аб'ектаў з усходняга і заходняга бакоў рынку, замацаваць пешаходную зону...

Ці калі-небудзь здзейсніцца ў Орлі рэканструкцыя гістарычнага цэнтра — гэта пытанне без адказу.

Міхал Мінцэвіч

Могільнік — сведка гісторыі

У Чаромсе-Станцыі два каталіцкія могільнікі — стары і новы. Першы знаходзіцца за даўнейшай чыгуначнай амбулаторыяй, а другі — ва ўрочышчы Каганка пры пуці на лініі Чаромха — Седльцы. Пацікавіўся я гісторыяй першага. На пліце безыменнай магілы прачытаў: „Żołnierzom poległym w obronie Ojczyzny w latach 1918-1920". Чарамшане казалі, што найстарэйшымі лічацца тры магілы з праваслаўнымі крыжамі. У гміне запісана, што гэта магілы рускіх салдат. У мінулым годзе былі адноўлены крыжы і агароджа. Гаворыцца, што маці Тадэвуша Кастоўскага ведала прозвішчы памерлых, але адышла з гэтага свету, забраўшы з сабою таямніцу. Нявестка яе мяркуе, што гэта брацкія магілы невядомых салдат з нямецка-рускай вайны 1914 года. На старым могільніку пакояцца астанкі чаромхаўскіх настаўнікаў: Мікіты Карповіча, які памёр 11 лістапада 1972 года і Зыгмунта Місевіча пахаванага ў 1943 годзе.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Праваслаўныя крыжы на каталіцкім могільніку

— Місевіч, — гаварыў Тадэвуш Кастоўскі, — мяне вучыў матэматыкі ў 1935-1939 гадах. Строгі быў ды ведаў ад вучняў патрабаваў.

Падаўся я да Чэслава Разбіцкага, які дваццаць пяць гадоў займаўся капаннем магіл.

— Ці памятаеце штосьці пра магілы з праваслаўнымі крыжамі? — запытаў я 86-гадовага былога далакопа.

— А як жа. У адной пахаваны Валерыянаў, які канторшчыкам на чыгунцы ў начальніка Мазуркевіча працаваў. Прозвішча другое ведаў, але яксьці зараз з памяці вылецела.

— Як хавалі маці Ірэны Пацяркоўскай, дык мы ямку капалі, — заявіла жонка Разбіцкага. — Ніяк долка не маглі выкапаць. Перашкода знайшлася. У канцы з ямкі жалезны ложак выцягнулі, салдацкія боты (нямецкія) і чэрап.

Пацвердзіўся затым тэзіс Марыі Кастоўскай, што раней тут былі захаваны астанкі нямецкіх салдат з першай сусветнай вайны.

Уладзімір Сідарук

Тузік памёр ад самоты і суму. Тады Лёдзя паехала з Казахстана ў Мінск.

Пані Лёдзя вярнулася

Пані Лёдзя едзе ў Мінск з Беластока. На рэйсавым аўтобусе. З польскім свежым пашпартам. Без вялікага багажу. Навазілася. З-пад Гродна вывезлі ўсю сям'ю ў Казахстан. Сама грамадзянства не мяняла: „Заўша былам польска!" Сястра Нюра ў часы СССР вярнулася ў Беларусь. Жыве ў Мінску. Лёдзя з мужам жыла там, у іншым клімаце. Звыклася. Не жылося ім, Лёдзі з мужам Міколам і дачкой Ганнай, кепска.

— Мелі домік, двухпавярховы, з агародам. Я не была абы-хто — распараджалася будматэрыяламі для кааператыўнага і калгаснага будаўніцтва. Чалавек на сур'ёзнай пасадзе, можна было шмат што „залатвіць", — усміхаецца да сваіх успамінаў пані Лёдзя. — Спачатку гаворыць па-руску (я спачатку не магу зведаць — хто яна па-нацыянальнасці, калі пачынаем размову), пасля стараецца па-польску з моцным беларускім акцэнтам, пасля і па-беларуску шмат выходзіць з яе вуснаў, пэўна, незаўважна для яе самое... — Зарабляла шмат. Дачка штудзіравала мовы. Унучка Каралінка нарадзілася... Вось і адправілі мяне на пенсію. Тады і часу больш стала... А то ад работы галавы не падымала. І да сястры рашыла з'ездзіць. У Беларусі добра, не той клімат, што ў нас, у Казахстане. Днём нясцерпная гарачыня, ноччу — зябка...

Упраўляліся з мужам з агародам. І Мікола захварэў. Чуе, паміраць прыйдзецца. Ляжаў у пакойчыку на другім паверсе.

— Пакліч Тузіка, хачу з ім развітацца.

Тузік жыў у будцы пад яблынькай, на пакоі не хадзіў ніколі. Паклікала яго гаспадыня — толькі з'ёжыўся. Узяла яго за ашыйнік, павяла да гаспадара. Паклаў стары сабака галаву на падушку і заплакаў.

На пахаванні Міколы было шмат людзей. З усімі сябравалі. А пасля Лёдзі засталася толькі дачка з Каралінкай. Унучка добра вучыцца — ведае мовы і казахскую, і англійскую, і польскую мову вывучае. У польскую нядзельную школку ходзіць. Кажа дачка: „Давай, мама, паедзем на радзіму, у Польшчу. Туды нас цяпер клічуць. Гэта ж наша... І праца, і жытло будзе..."

— Я і падумала: „Гэта ж радзіма!" Я ж каталічка. У Польшчы народжаная. І ўнучка хай сярод сваіх жыве. Якое тут ёй жыццё... У Еўропу ехаць, а не сядзець на гэтым канцы свету. Праўда, у Ганулькі праца вельмі добрая, яшчэ і ўрокі дае. Грошай шмат зарабляе, няма на што наракаць...

Але да сястры, у Мінск спачатку пацягнула паню Лёдзю. Ды Тузіка трэба пакінуць аднаго — дачка жыве ў цэнтры горада — каб суседзі дбалі.

— Дала я ім грошай, каб Тузіка добра кармілі. І прасіла, каб дапільнавалі, толькі каб добра жыў, каб у будцы чыста, каб міска не ў гразі... Каб спускалі яго пабегаць па агародзе. І паехала.

— Можа, і жыць у Беларусі? — раздумвала Лёдзя ў сястры ў Мінску. — Ой, як свойска, і горад такі харошы, чысты. Людзі такія родныя... Яшчэ можна было перасяліцца без праблем. Людзям з усяго Саюза Беларусь падабаецца. Гэтак, ведаеце, па-еўрапейску. І ў касцёл хадзіла, сястра блізенька жыве.

Сніўся ёй Тузік. Што выбягае перад брамку і чакае яе, выглядае. Схуднеў. Што лягае на пыле і плача, і скуголіць. І не стрымала, спакавала торбу. Накупіла ўсяго дачцэ і ўнучцы, суседзям, набыла і пачастунак сабаку. І паляцела дахаты.

У аўтобусе з аэрапорта турбавала яе думка, што з Тузікам кепска. З усімі багажамі пайшла адразу на сваю вуліцу. Убачыла расчыненую брамку.

— Учора здох, — паведаміла яе казашка, што апекавалася хатай і дабыткам. — Нічога не еў. Ні мяса, ні купных кансерваў, ні хрупак.

Тузік трохі піў быў ваду, а пасля і перастаў. Вывалакаўся на вуліцу, выглядаў гаспадыню. Пасля пайшоў шукаць. Бачылі яго ў аэрапорце. Вярнуўся дадому. Сядзеў пад плотам, ці сонца паліла, ці калаціла яго схуднелае цела зяба. Там і кончыўся.

Лёдзя паглядзела на закарэлую місачку пад перакуленай будкай і пайшла ў свой пусты дом. Пазваніла дачцэ: „У мяне тут ужо нічога няма. Еду ў Польшчу! А потым і вас забяру".

У Беластоку жыве брат Лёдзінага мужа Міколы. Добра, кажа, жыве. Мае двухсямейную вілу, сваіх дзяцей у людзі адправіў, пабудаваў.

— Гэта раней усё зрабіў, — кажа пані Лёдзя. — Цяпер то цяжэйшы час і ў вас.

— У вас, — кажу. — Вы ж цяпер „наша". І як вас родная Польшча сустрэла?

— Ну, нашто ёй пенсіянерка. Далі столькі, як найменшая рэнта. Трохі за чатырыста злотых. За такія грошы то я там жыла б! Дарэчы, там я мела адну з найбольшых пенсій, бо ж надта добра зарабляла... Пажыла я крыху ў шваграра. А цяпер наняла я пакойчык у ягонага суседа. І за гаспадыню раблю. Анатоль зусім старэнькі. Мае ветэранскую пенсію. Вельмі прыстойны старэча. Кажа, можа шлюб нам узяць, каб людзі не гаварылі. Якая там любоў на старасць! Мы ж — сябры, прыяцелі. Ягоныя дзеці не былі б супраць. Ды які ж мне абавязак — дбаць пра яго! Лепш проста так — хай разлічвае на мяне, калі што... Можа, і тут не маё месца...

Дачка пані Лёдзі мае ахвоту прывезці сюды сваю Каралінку. Гэта дзеля будучыні малое.

— Тут жа ж яе радзінны край! — тлумачыць бабуля. — І Ганулька працу знайшла б. Галоўнае цяпер у Еўропе, у свеце — мовы ведаць.

Едзе з напакаванай торбай пані Лёдзя да свае сястры Нюры ў Мінск. Будзе ў пляменніка вяселле. Жэніцца з беларускай, ну, праваслаўнай. Пабудзе бабка Лёдзя тыдні тры, вернецца, пільнаваць свайго дзедку Анатоля, які ў сваім доме трымае для яе пакой.

Міра Лукша

Гмінная статыстыка

На 31 снежня 2001 года ў адзінаццаці салэцтвах Чаромхаўскай гміны пражывала 4 042 жыхары. Паводле статыстыкі больш людзей памірае чымсьці родзіцца. Для прыкладу: у 2000 г. нарадзілася — 35, памерлі — 43. Адпаведна ў 2001 г. — 37 і 41, а ў мінулым — 39 і 53.

Самай старэйшай асобай лічыцца Сцепаніда Саснюк са Ставішчаў. 4 лютага споўнілася ёй 99 гадоў. Бабулька жыве пры дачцэ Ніне і зяцю Сяргею Рошчанках. Адчувае сябе добра. Да дзевяностагодкаў можна залічыць Анну Гарбачук, Васіля Іванюка і Станіслава Краўчык з Чаромхі-Станцыі, Браніслава Ярмуловіча і Зофію Рожук з Баброўкі і Рыгора Саўчука з Кузавы.

(ус)

Калі гэта скончыцца?

У канцы мінулага года суполка ПКП Рэгіянальны транспарт выступіла з прапановай да чыгуначнікаў наконт выкупкі ільгот на праезды. Кожны з працаўнікоў і пенсіянераў заплаціў назначаную стаўку. У маім выпадку гэта сума 57,50 зл. (47,50 зл. за жонку і 10 зл. за пасведчанне дакументаў). Апрача таго, з пачаткам студзеня ільготнікі вымушаны за кожны праезд заплаціць 2,20 зл. у касе, г.зн. выкупіць білет. Значыць, чыгуначнікі не ездзяць дарма. Не разумею у такім выпадку чарговага закалоту ў масмедыях наконт ліквідацыі нерэнтабельных ліній на Гайнаўшчыне. Стаўлю пытанне дырэктару Прадпрыемства пасажырскіх перавозаў у Беластоку: Як ён думае вывязацца з дагавору аб перавозцы з чыгуначнікамі, паколькі прадпрыемства ўзяло грошы ад нас у касу? Якім транспартам будзем карыстацца? Паколькі гэта чарговая спроба прыманіць гмінныя самаўрады на датацыі, дык гэта нелагічна. Мне здаецца, што ў рыначнай эканоміцы час узяцца за канкрэтную працу, а не выглядаць нябеснай манны. Гміны не могуць быць дойнаю каровай для няўдачнікаў. І яшчэ адно. У „Кур'еры Паранным" ад 17 студзеня пісалі, што суполцы „Cargo" таварны транспарт аплачваецца ўжо ад Хрызанова (ранейшы перагрузачны пункт Семяноўкі). Мой сябрук-чыгуначнік так гэта канстатаваў: Нашы беларусы надта цярплівыя. На Шлёнску даўно зрабілі б парадак. Праз Чаромху і Гайнаўку, як вядома, перавозяць усякія хімікаты. Хопіць малой аварыі цыстэрны і ўзрываемся ў паветра або атручваемся. Ці кагосьці з-за гэтага галава баліць? Напэўна не. Грамадскасць усходняга пагранічча — гэта людзі другой катэгорыі. Ніхто з намі не лічыцца.

Памятаю, як шэф Падляшскага рэгіёна „Салідарнасці", тады пасол Сейма, Юзаф Мазалеўскі на сходзе ў Чаромсе абяцаў пахадайнічаць за тое, каб у цэнтральным бюджэце знайшліся грошы на рамонт лініі Чаромха — Беласток, калі не ў 2001 годзе, дык у наступным напэўна. Асечка выйшла. Перад выбарамі Гайнаўшчыну наведвалі прэзідэнт, прэм'еры і маршалак Сейма. Хадзілі ў царкву, каб даказаць сваю падтрымку праваслаўнаму народу. Зараз адварочваюцца. Як доўга будуць маніць абяцанкамі? Ці не час з гэтым скончыць? На маю думку, трэба актыўна дабівацца ў адказных установах за вяртанне на Гайнаўшчыну чыгуначнага транспарту — самага таннага, ды бяспечнага. Маем на гэта права. Калі Еўрасаюз прызначае грошы на экалогію, дык чаму ж не пахадайнічаць, каб далі на лінію Белавежа — Гайнаўка — Бельск-Падляшскі ці Чаромха — Беласток. Аўтамабільны транспарт для жамчужыны — Белавежскай пушчы — гэта знішчэнне натуры. Давайце сцяной станем за слушную справу — абаронім чыгуначны транспарт, як сваё здароўе. Няхай Гайнаўшчына стане сапраўднымі Зялёнымі лёгкімі Польшчы.

Уладзімір Сідарук

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

У Гайнаўцы гулялі наймалодшыя

19 студзеня г.г. з 16 да 20 гадзіны ў рэстаране „Белая ружа" ў Гайнаўцы адбыўся дзіцячы маскарадны баль. Удзельнічала ў ім каля сарака дзяцей з прадшколляў і першых класаў пачатковых школ; быў гэта адзіны такога роду баль у Гайнаўцы.

У часе мерапрыемства былі арганізаваны цікавыя конкурсы. У першым конкурсе (вакальным) „Залаты мікрафон" першы прыз узяла Анэта Манькоўская, яна перамагла і ў другім (дэкламатарскім) „Залатыя вусны". Трэці конкурс (танцавальны) „Залатыя туфелькі" выйграла Ізабела Стахура, чацвёрты, касцюмны, — Дыяна Семянюк; спецыяльны прыз ад працоўнага калектыву „Белай ружы" атрымаў „Зорра" — Данель Сурэль.

Завадатарам забавы быў Пётр Мацарскі з Беластока, які пераапрануўшыся ў Дзеда Мароза ўручыў дзеткам падарункі, якія фундавала варшаўская фірма Ірэны і Зіновія Галёнкаў „Зэгір". Пасля мерапрыемства сказалі мне яны:

— Дзеці прыйшлі на баль разам з бацькамі, таксама прыгожа апранутымі. Дзеці не хацелі дзіцячай музыкі, толькі дыскатэкавую, у тым ліку і з папулярным гітам „Нас не догонят". Ці падабалася забава? Адна мама сказала, што была намнога лепшая, чым у прадшколлі. Было ўжо гэта другое такога роду мерапрыемства, — дадаў Зіновій Галёнка, арганізатар і спонсар.

Уладальнікі рэстарана запрашаюць усіх ахвотных дзетак на баль закаханых дашкольнікаў у нядзелю 16 лютага ў 16 гадзін. У праграме гульні выбар Рамео і Джульеты. Усіх чакаюць сувеніры.

Міхал Мінцэвіч

Пажарнікі з Трасцянкі

Добраахвотная пажарная каманда ў Трасцянцы, што ў Нарваўскай гміне, бесперапынна дзейнічае ад 1933 года. Цяпер у ёй 30 членаў у розным узросце. Наймалодшаму члену-добраахвотніку 17 гадоў. Найстарэйшым членам пажарнай каманды, яе заснавальнікам і актыўным дзеячам у маладыя гады, з'яўляецца Ян Тайгуноў. Яму 96 гадоў. Час-часом прыходзіць на пажарніцкія сходы паслухаць, як дзейнічае трасцянніцкая добраахвотная пажарная каманда ды часам што-небудзь падкажа. Часта расказвае, як дзейнічалі пажарнікі ў мінулым, як некалі карысталіся ручною помпай папулярна званай „Волга-Волга" ды бочкамі ў 200 літраў вады замацаваных на конных павозках на драўляных колах акаваных жалезам. На гэтым транспарце яны даязджалі тушыць пажары ў аддаленую на 12 кіламетраў Нарву і навакольныя вёскі.

Старшынёю добраахвотнай пажарнай каманды ў Трасцянцы больш за 10 гадоў з'яўляецца Мікалай Максімчук. Пажарнікі карыстаюцца пажарнай машынай „Стар-20" з 1964 года, і, як на цяперашні час, машына ўжо непрыдатная, але гмінныя ўлады беднаватыя, каб купіць новы самаход. Варта тут адзначыць, што Нарва — сялянская гміна і вельмі малы тут даход ад падаткаў. Нядаўна пажарнікаў з Трасцянкі ўключылі ў краёвую сістэму выратавання. Яны, як добраахвотнікі, выязджаюць да пажараў, паводкі і дарожных аварый не маючы для гэтага адпаведных прыладаў. Варта, каб ваяводскія ўлады выдзелілі з ваяводскага бюджэту адпаведную суму грошай на неабходныя пажарніцкія прылады і, канешне, новы самаход. За гэта былі б вельмі ўдзячны жыхары Трасцянкі і навакольных вёсак.

Мікалай Лук'янюк

Пад стрэшкай

Сустракаем іх пры кожнай важнейшай камунікацыйнай артэрыі. Многа іх. Не ўсюды відаць належную турботу за імі. А рэч ідзе пра трохсценныя пачакальні на аўтобусных прыпынках ПКС. Гэтым разам пазітыўны прыклад з Міхалоўскай гміны (Беластоцкі павет).

Тамашнія ўлады паклапаціліся пра пачакальні, між іншым, у Бандарах, Юшкавым Грудзе, Баршчэве, Леўшах, Новай Волі, Міхалове (тут іх два і адзін з іх у мінулым годзе пабудаваны) і ў Жэдні. Цяпер усе, хто чакае „свайго" аўтобуса, могуць схавацца за сценкай і пад стрэшкай.

Варта дадаць, што вышэйзгаданыя малыя пачакальні знаходзяцца пры адной асфальтаванай дарозе з інтэнсіўным рухам аўтамабіляў з Бандароў у Беласток.

(яц)

Раённы з'езд пенсіянераў у Гайнаўцы

25 лютага г.г. адбудзецца раённы з'езд Польскага саюза пенсіянераў, рэнтыстаў і інвалідаў у Гайнаўцы. На ім будуць выбраны новыя ўлады Аддзела ПСПРіІ ды прыняты накірункі дзейнасці на чарговыя 4 гады. На з'ездзе 700 членаў арганізацыі будзе прадстаўляць 16 дэлегатаў. Справаздачу з дзейнасці Раённага аддзела ПСПРіІ зробіць старшыня Мікалай Чыквін. З'езд будзе праходзіць у канферэнц-зале (зала н-р 12) Гарадской установы ў Гайнаўцы па вул. А. Зіна 1. Пачатак а 10 гадзіне.

(яц)

Гмінныя інвестыцыі

У Нарваўскай гміне пры канцы снежня мінулага і ў пачатку студзеня гэтага года праходзілі выбары солтысаў. У тыя дні войт гміны Якуб Садоўскі стараўся быць у кожнай вёсцы, каб паінфармаваць грамадства аб гмінных планах.

У гэтым годзе самымі важнымі інвестыцыямі будуць ачышчальня сцёкаў у Нарве і водаправод у вёсках Анцуты і Трасцянка.

У 2004 годзе плануецца давесці ваду ў Бялкі і Адрынкі. У планах таксама рамонты гмінных дарог і вясковых святліц. Хацелася б пажадаць войту Якубу Садоўскаму здзяйснення планаў. (мл)

Узнікне Інстытут ураўнаважанага развіцця

Інстытут ураўнаважанага развіцця, так званая „зялёная школа", будзе заснаваны ў Нараўцы (Гайнаўскі павет). На яго прадназначылі колішнія, але ў добрым стане школьныя будынкі па вуліцы Міцкевіча. У іх будуць аўдыторыі, гасцініца, кухня. Будуць таксама атэльле, лабараторыі. Інстытут будзе служыць экалагічнай адукацыі.

Апусцелыя будынкі пачнуць прыстасоўваць на патрэбы ІУР сёлета. Пад распараджэнне навуковай установы гмінныя ўлады перададуць яшчэ невялікі зямельны ўчастак над Семяноўскім вадасховішчам. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2003 r. upływa 5 marca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Факты і высновы

Дзеля дабра чалавека

На парозе Новага года навукоўцы падарылі нам геном мышы. Выявілі ледзь не поўны запіс ДНК найбольш заслужанай для чалавека жывёліны. Адкрылі, што мышыныя гены амаль такія ж, як і ў чалавека. Адкрылі перспектыўнасць новых эксперыментаў.

Ужо здаўна млекакормячае, пагардліва названае грызуном, ратавала чалавеку жыццё. Цяпер можа нават прадоўжыць існаванне нашага роду. Вучоныя ў натхненні вострацъ скальпелі на новыя здзяйсненні. І мыш пакорліва ідзе на нечалавечыя мукі. Усё сцерпіць дзеля нашага дабра.

А мы ўсё ставім мудрагелістыя пасткі на нашага ратаўніка. І яшчэ ганарымся сваім гуманізмам. Якая крывадушнасць! Услаўляем ваенную мясарубку, ідыёцкія паўстанні. Славалюбным разнікам ставім помнікі.

Пара апамятацца. Герой нашага часу — мыш. Яе і на п'едэстал!

Як быць?

Хто такі журналіст? — пытае сталічны тыднёвік. — Гіена ці IV улада?

Ні тое ні тое. Журналіст — каварнае пудзіла. Зышліся Адась і Лёўка. Пашчыравалі, як сябар з сябрам, і, задаволеныя, разышліся. Праўда, цешыўся толькі Адась, які здолеў запісаць кантачанне на запазушны магнітафон. У яго такая звычка. Рэдактар. Пабавіўшыя паўгода цацкай, пусціў яе ў сваю газету: хай пабавяцца і чытачы.

А ім не да забавы. Іх ахапіў жах: мо і мяне нехта запісаў? Чакаюць, перапуджаныя, калі і яны стануць героямі дня. Нават прэзідэнт не вытрымаў і забараніў сваім міністрам *uczestnictwa w wydarzeniach natury prywatno-osobistej ludzi biznesu czy ludzi mediów*.

Ім што, будзьце чуйнымі — Адась не дрэмле! А як мне быць? Ноччу гаварыў праз сон з нейкай паскудай. І благаверная запісала падзею на магнітафон. Кажа, крымінал. Страшыць, што апублікуе ў „Ніве".

Сідар Макацёр

Адгаданка

Каля вогнішча ў растках

(чатырохкратная анаграма)

З сябрамі ля _ _ _ _ _ _ сядзеў Лявон, полымя залаціста танцавала
І гутарка мужчын, спачатку ціхая, з працягам часу магутнай сілы набірала.
Аж, глянь: Лявоніха бяжыць! Прыціхлі мужыкі, а яна ў плач і лямант:
Ты, прайдзісвеце, гавары, дзе _ _ _ _ _ _, паўлітроўка, што ў куфэрку я трымала!
Ікнуў Лявон: Вядома, што не ведаю нічога, як Ксанціпе гаварыў калісь _ _ _ _ _ _.
Павесіла нос баба і раскрыла вочы: спускае пляшка дух каля вішнёвага _ _ _ _ _ _.

(Ш)

Рашэннем анаграмы з'яўляюцца словы (тут: чатыры), якія складаюцца з аднолькавага набору літар; напрыклад з літар *к, с, у* можна скласці двайную анаграму *сук* і *кус*. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнні адгаданак з 52 нумара

1. Канюшына. 2. Іван, „Ніва", Вані, віна. 3. Белавежа. 4. А рака кара. 5. Слонім (Слон ім).

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Візіт у Лявонскім лесе

У гэтым тыдні выключна не адбыўся сход уселяснога кіраўніцтва. Яго вялічаства мядзведзь Сандар Жоржавіч выбыў з афіцыйным візітам у Лявонскі лес, значыць, за мяжу, якую ласкава дазволілі яму перасячы, а трэба дадаць, што такіх нагод у апошні ды перадапошні часы не было. Проста скажам: урэшце ж яго запрасілі. І таму рыхтаваўся ў сваёй бярлозе старанна: прычасаў шэрсць, акуратна выцер у свежы мох лапы, выкалупаў з зубоў рэштку падлы сасновай ігліцай. Наканец папёр у Лявонскі лес, дзе ўжо чакалі яго воўк Нятупін і гаспадар Лявоніі янот Кумач.

На суседнюю паляну ўкрочыў у поўнай мядзведжай велічы.

Хацеў прысесці. Але ні Кумач, нават і не Нятупін не паказалі, дзе мела б быць ягоная частка паляны, на якую меў пляснуць задам. Так вось там, дзе стаяў, туды і сеў.

— Вітаю вас, вельмішаноўны воўча і вас, так сказаць, Жоржавічу, мядзведзю, — пачаў Кумач.

Гэта Сандара Жоржавіча ўсхвалявала. Выказаў толькі:

— Адчувайце сябе быць прывітанымі!

Халоднае вітанне перарваў воўк Нятупін:

— Сёння трэба выбраць правадыра нашага Саюза Лясных Дзяржаў, у скарачэнні СЛД.

— Дачакаўся, урэшце. Надышла мая хвіліна! — радасна задумаўся мядзведзь.

Уявіў сабе багацце лясных покрываў усяго СЛД, над якім запануе, усё багацце падлы і вегетарыянскага корму, дзякуючы якому яго лясная брацыя пажыцёва аддасць яму ўладу над узлескамі, а, мабыць, і над суседнімі ды адлеглымі зараснікамі.

— Пракармлю і сябе, і штосьці скубне маё кіраўніцтва, ды і лясной брацыі крышачку накапаецца! — аддаўся мроям.

Тым часам Нятупін працягваў:

— Трэба ачысціць пагрэбаванае імя нашага брата янота. Таму хай будзе так: Кумача паставіць на пост, значыцца, на ўзровень СЛД.

— Врр-р-р! — толькі мармытнуў Жоржавіч.

— Што гэта за такое „ўр"? — воўк і янот з дзівам глянулі на мядзведзя.

— Не-не, штосьці мне ўкалолася ў лапу.

— Ну, дык хай нам жыве наш новы пан Саюза! Кумач! — узняў вокліч воўк Нятупін. — Кумач, янот, ура-а!

— Хай. Ура, ура, — са скрухай прастагнаў мядзведзь.

Гэтак закончылася сустрэча ў Лявонскім лесе. Дома чакаў мядзведзя ўвесь уселясны сход.

— Ну і што, што? — дапытваліся вавёрка Кацюша, лань Гаўрусіха ды дзік Свіналыч.

— Ну і бздо! — буркнуў мядзведзь і абярнуўся задам ды прапаў у тхлані свае бярлогі.

Толькі дзяцел Стукач ні пра што не пытаўся. Маўчаў, нават дзюбы не высунуў з кары дубовага пня.

— Лепш трымаць сваю дзюбу ў лубе! — меркаваў.

Адным вокам пазіраў у бок Лявонскага лесу. Другім — у старонку ўладзімірскую. Калі мядзведзь прапаў у нетрах свае сядзібы, Стукач схацеў паляцець у сваё дупло. Ды не змог: дзюба ўбілася ў дуб дашчэнту:

— Ну, і нашто мне гэтак было, нашто?! Столькі ахвярнасці, такая вернасць! Нічога я ўжо нэ куматы. Ой, запрашу я хіба змяю Ссапію і таго вужа Ззянона на пачастунак. Пара лес зварухнуць. Толькі чым ім дагадзіць, якую гасціну рыхтаваць?

МакХолад

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

У лекара:

— У вас у страўніку гадзіннік! Ці не дастаўляе ён вам клопатаў?

— Вядома, дастаўляе — асабліва падчас завядзення.

* * *

— Вам трэба часцей купацца!

— Пан доктар, я купаюся штодзень.

— Тады часцей мяняйце ваду ў ванне.

* * *

Пара жыхароў Марса, ён і яна, прызямліліся на адным варшаўскім балконе. Гаспадары кватэры прынялі іх, угасцілі і дагаварыліся, што марсіянін пойдзе спаць з гаспадыняй, а марсіянка з гаспадаром. Калі ўжо паклаліся сам-на-сам, гаспадыня стала смяяцца, бо пабачыла тонкае і кароткае. Аднак марсіянін пацягнуў сваё правае вуха і арган выдаўжыўся, а калі пацягнуў левае — патаўсцеў.

Раніцай гаспадыня, як жаваранак, увіхалася каля снедання.

— І як было? — пытае яе гаспадар.

— Цудоўна! А табе?

— Ат, усю ноч толькі цягала мяне за вушы.

* * *

Клерк да прыбіральшчыцы:

— Куды дзеўся пыл з майго стала?! Там былі запісаны важныя тэлефоны.

* * *

— Пан доктар запісаў мужу неадпаведнае лякарства ад болю страўніка.

— Няўжо?

— Вы сказалі, каб у прыступе болю выпіваў піва.

— Усё згаджаецца.

— Бачыце, раней мужу балела раз у суткі, а цяпер — тры разы.

* * *

Андрэй захварэў.

— Чаму не п'еш гэтага лякарства? — спагадліва пытае жонка.

— Бо надта нясмачнае.

— Тады ўяўляй, што гэта піва.

— Я б з ахвотаю напіўся піва і ўяўляў, што гэта лякарства.

* * *

Мікола з'яўляецца ў лекара:

— Пан доктар, гэтыя таблеткі, што вы мне запісалі, нічога не памагаюць: надалей ноччу не магу заснуць.

— У такім выпадку выпівайце штогадзіну піва.

— Думаеце, што гэта паможа?

— Не ведаю, але напэўна дазволіць вам прыемна правесці час.

* * *

— Андрэй, чаму п'еш піва праз саломінку?

— Бо лекар загадаў мне трымацца здалёк ад алкаголю.

* * *

Хворы паказвае лекару зусім счарнелы язык.

— Што сталася? — пытае ўрач.

— Няшчасце: вылілася мне піва на толькі што пакладзены асфальт.

* * *

Кавальскі вярнуўся з экскурсіі ў Афрыку і паказвае сябру здымкі:

— Тут, каля гэтае гарылы, стаю я.

— Бачу! Пазнаў па капелюшы.

ISSN 0546-1960